Лаўрэаты спецпрэміі Прэзідэнта Беларусі: хто ёсць хто

СТАР. 3

Які ён, дом начнога знаходжання, і яго насельнікі?

СТАР. 5

Першы слуцкі пояс вярнуўся на радзіму

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

14 СТУДЗЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 5 (27615) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МАЙСТЭРСТВА БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМІ

Шчасце — гэта вялікае майстэрства, якое кожны чалавек штодзень стварае сваімі рукамі. Такое меркаванне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў 12 студзеня на традыцыйным прыёме з нагоды старога Новага года, перадае карэспандэнт БЕЛТА .

Фота БЕЛТА.

«Наша шчасце — не божы дар, а вялікае майстэрства, якое кожны чалавек штодзень стварае сваімі рукамі. І толькі ад нас залежыць, наколькі больш шчаслівымі мы зможам стаць у новым годзе», — сказаў беларускі лідар.

На прыём былі запрошаны вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, дзеячы культуры, спорту, журналісты.

«Усім нам хочацца, каб наша краіна была паспяховай. Але ў чым праяўляецца гэты поспех? За лічбамі і паказчыкамі мы часта не заўважаем больш важныя рэчы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Адзін разумны чалавек заўважыў: «Паспяховая тая краіна, у якой ёсць алімпійскія чэмпіёны, Акадэмія навук і нацыянальнае опернае мастацтва».

Паводле слоў Прэзідэнта, гэта, магчыма, непрывычны погляд, але разам з тым мастацтва — гэта духоўнасць, навука — інтэлект, а спартыўныя перамогі — сплаў сілы духу і фізічных магчымасцяў чалавека. «Любы поспех у гэтых сферах прадстаўляе дзяржаву ў свеце лепш за ўсялякую дыпламатыю. І калі ў краіне ёсць умовы, каб развіваць гэтыя таленты, значыць, гэта пасапраўднаму паспяховая краіна. Прынамсі, можа прэтэндаваць на такое званне», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што перамогі на буйных міжнародных спаборніцтвах або вырашальны гол у матчы — гэта не проста эпізоды спартыўнага жыцця, а мяжа чалавечых сіл, пераступіць якую часам уяўляецца немагчымым. «Але кожны раз яна пераадольваецца неймаверным намаганнем і напружаннем волі. У такія імгненні кожны адчувае надзвычайны душэўны ўздым і гонар за гэта пераможнае імгненне, за нашу краіну», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пераканаўся, што таксама і ў творчасці. Напрыклад, калі артыст выходзіць на сцэну такога конкурсу, як «Еўрабачанне», яго слухае ўся Еўропа і па адной яго песні мяркуюць аб усёй краіне. «У такой сітуацыі складана нават дарасламу артысту, а што гаварыць аб дзецях? Але нашы дзеці штогод праслаўляюць Беларусь на гэтым прэстыжным конкурсе. Пара б і дарослым узяць прыклад з дзяцей», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што такія дасягненні дастойныя самага высокага дзяржаўнага прызнання.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і Падзякі Прэзідэнта заслужаным людзям краіны. «Сёння мы ўшаноўваем тых, хто дабіўся поспеху ў творчасці, спорце, на дзяржаўнай службе дзякуючы вялікай працавітасці, любові да сваёй справы і веры ў сябе. Яны ішлі наперад да вяршынь, таму што былі па-сапраўднаму, горача ўлюбёныя ў сваю справу і не прывыклі адступаць перад цяжкасцямі. У гэтым і заключаецца сапраўдны патрыятызм», — падкрэсліў Прэзідэнт.

За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у дзяржаўнае будаўніцтва і сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ордэна Айчыны III ступені ўдастоены кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэй Кабякоў, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый Вакульчык.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны таксама міністр абароны Юрый Жадобін і міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч за ўзорнае выкананне воінскага абавязку, службовых абавязкаў, высокі прафесіяналізм і ўмацаванне абараназдольнасці дзяржавы.

Ордэнам Пашаны адзначаны памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў і старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына.

Аляксандр Лукашэнка ўдастоіў дзяржаўных узнагарод членаў каманды Прэзідэнта Беларусі па хакей.

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны Вадзім Бекбулатаў.

Медалём «За працоўныя заслугі» адзначаны Дзмітрый Баскаў, Алег Мікульчык, Сяргей Шыткоўскі, Алег Антоненка, Сцяпан Панамароў і Уладзімір Цыплакоў.

Ганаровае званне заслужанага трэнера Беларусі прысвоена Андрэю Гусаву, заслужанага майстра спорту Беларусі — Андрэю Асташэвічу, Паўлу Беламу, Сяргею Задзяленаву, Андрэю Міхалёву і Генадзю Савілаву.

Медалём «За працоўныя заслугі» таксама ўзнагароджаны спартсмен-інструктар хакейнага клуба «Гомель» Леанід Грышукевіч.

Гэтай жа ўзнагародай адзначаны заслугі артыста-вакаліста Магілёўскай абласной філармоніі Іскуі Абалян.

Медаля Францыска Скарыны ўдастоены артысты-вакалісты Маладзёжнага тэатра эстрады Вікторыя Алешка і Дзмітрый Танюкевіч, аглядальнік рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» Аэліта Сюльжына, намеснік галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант.

Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена артысту-вакалісту (салісту) Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь Дзмітрыю Качароўскаму за высокія творчыя дасягненні і значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры.

Акрамя таго, за значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, асвятленне падзей грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена рэдактару аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» Святлане Протас і спецыяльнаму карэспандэнту ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Марыне Цімафеевай.

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў медалём Францыска Скарыны мастацкага кіраўніка музычнага прадзюсарскага цэнтра «Залатыя галасы» Валерыя Шмата.

Выканаўчаму прадзюсару галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 2» Белтэлерадыёкампаніі Людміле Барадзіной прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

Такой высокай ацэнкі яны ўдастоены за значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры, папулярызацыю беларускага музычнага мастацтва і выхаванне творчай моладзі, актыўны ўдзел у падрыхтоўцы дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013».

СТАР. 2

«НОВЫ ГОД ВАМ ПАЧЫНАЮ»

ПРАКАВЕТНАЕ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Чаму на Шчадрэц стол павінен быў ламіцца ад страў, а 14 студзеня ў хаце ўжо не павінна быць навагодняй ёлкі

Дазвольце спытаць, шаноўныя: як вы правялі ўчарашні вечар? Проста лягліспаць, паглядзеўшы канцэрт, прымеркаваны да гэтага дзіўнага свята, якое адзначаюць толькі на прасторах былога Саюза, — старога Новага года? Гэта вы дарэмна... Таму што, згодна з беларускай народнай традыцыяй, якой ужо не адна сотня (а можа, і тысяча?) гадоў, гэта адзін з самых сімвалічных вечароў года, падчас якога сям'я ні больш ні менш — «праектавала» жыццё і дабрабыт на бліжэйшыя дванаццаць месяцаў.

Яго нездарма называюць Шчадрэц, Шчадруха, Таўстуха, Багатуха. Стол, за якім падчас вячэры 13 студзеня збіралася ўся сям'я, павінен быў літаральна ламіцца ад розных страў: тут і куцця, і мяса з каўбасамі, і кіслая капуста, і мочаныя яблыкі, і салёныя грыбы.

— Стол на Багатую куццю фактычна факусіраваў у сабе ўвесь каляндарны год, — расказвае этнограф, кандыдат філалагічных навук, галоўны рэдактар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Янка Крук. — Таму на ім павінна было прысутнічаць усё тое, на ўраджай і прыбытак чаго разлічвалі.

Куцця на гэтым стале займала ўсё тое ж пачэснае месца каля чырвонага кута, але яна, хоць і «шчодрая», не была тут галоўнай стравай. Гэту ролю выконвалі бліны, дакладней іх стос, у якім было дванаццаць штук — па колькасці месяцаў. Менавіта іх першымі ставілі на абрус. Пасля стос разразалі крыж-накрыж на чатыры часткі і кожны з радзіны за сталом браў па кавалку. Такім чынам стос (ён жа — год) знікаў з талеркі «па спіралі».

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:

«6,5 млн кв. м жылля плануецца пабудаваць у краіне ў 2014 годзе. У тым ліку плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 2,5 млн кв. м жылля за кошт дзяржаўнай падтрымкі. Гэта самы галоўны паказчык для нас. Таксама сёлета актыўна будзе весціся будаўніцтва па дзяржзаказе. Сэнс гэтага будаўніцтва заключаецца ў тым, каб выключыць чалавека з працэсу будаўніцтва: пабудаваць цалкам аб'ект, а затым прапанаваць яго ў першую чаргу тым, хто маюць патрэбу, каб людзі бралі крэдыт у банку і адразу пачыналі жыць і вяртаць затрачаныя на будаўніцтва грошы. Акрамя таго, актыўна будзе ажыццяўляцца праграма па будаўніцтве арэнднага жылля».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.01.2014 г.

Долар ЗША	9540,00	■
Еўра	13040,00	▲
Рас. руб.	288,00	▲
Укр. грыўня	1150,26	▼

Мітрапаліт ПАВЕЛ:

«ТОЕ, ЯК МЯНЕ ТУТ ПРЫМАЮЦЬ, ПЕРАСЯГНУЛА ЎСЕ МАЕ ЧАКАННІ»

Прайшло ўсяго 10 дзён, як у Беларусь прыбыў новы кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы. Надта мала часу нават для першых вынікаў. Па сутнасці, цяпер адбываецца ўзаемнае знаёмства паствы і пастыра. І казаць можна толькі пра першыя ўражанні. Таму мы пакуль не прасілі мітрапаліта Паўла аб вялікім інтэрв'ю для нашай газеты і задалі Яго Высокапраасвяшчэнству толькі адно пытанне. Такая кароткая размова адбылася яшчэ і таму, што здарылася яна на хаду, адразу пасля літургіі ў Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы, у дзень памяці 14 тысяч немаўлятак Віфлеемскіх.

Фота Уладзіслава КУЛЕЦКАГА.

— Уладыка, прайшоў тыдзень, як вы ступілі на беларускую зямлю ў якасці Патрыяршага Экзарха. Гэта быў цяжкі тыдзень?

— Вы ведаеце, як і ўсе нашы багаслужэбныя дні, і гэтыя былі загружаны, фізічна стамляешся, але духоўна проста лятаць хочацца. Любы чалавек, які здзяйсняе подзвіг на сваім шляху да Бога, фізічна, безумоўна, заўсёды стамляецца, бо плоць нядужая, слабая, але дух ад гэтага робіцца больш лёгкім, больш дасканалым. Гэтак жа і мінулы тыдзень: ён быў напоўнены і набажэнствамі, і малітвай, і зносінамі з паствай, і з пастырамі...

І хачу сказаць, што тое, як мяне тут прымаюць, перасягнула ўсе мае чаканні. І дарэмнай аказалася ўся мая боязь. Думаў у пачатку: як будзе, што будзе... Але я вельмі часта кажу: як толькі трапляю ў любой краіне ў праваслаўны храм, у мяне адразу ўзнікае адчуванне, што я дома. Тут мяне з любоўю прымаюць. Маё сэрца радуецца, бо я бачу цудоўных прыхаджан, добрых, поўных глыбокай пашаны да Бога. Я прыехаў не ў пустыню.

СТАР. 2

■ Надвор'е

НАПРЫКАНЦЫ ТЫДНЯ — МАРАЗЫ ДА МІНУС 18

У аўторак тэрыторыя Беларусі трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, якая была сфарміравана ў халодным паветры поўдня Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Таму будзе воблачна з праясненнямі і без істотных ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца, вецер няўстойлівы слабы. Максімальная тэмпература паветра — ад 0 да мінус 6 градусаў. А вось у сераду, пад уплывам атмасферных франтоў з боку Заходняй Еўропы, амаль паўсюдна прагназуецца снег, а па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей магчымы дождж і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ў ноч на сераду будзе вагацца ад мінус 1 градуса па паўднёвым захадзе да 13 марозу па паўночным усходзе краіны. Удзень чакаецца мінус 1—7 градусаў, а па поўдні Беларусі — каля 0. Тэмпература паветра на працягу сутак у чацвер будзе вагацца ў межах мінус 2-8 градусаў, толькі ўначы па поўначы — 9—12 марозу.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу і суботу атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў ужо не будзе. Тэмпература паветра ўначы будзе дасягаць мінус 8—14 градусаў, а пры праясненнях — 15—18 марозу. Удзень — мінус 5—11 градусаў, і толькі па паўднёвым захадзе ўначы 1—7 марозу, а ўдзень — ад 0 да мінус 4 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЛАТВІЙСКІХ ШПРОТАХ ВЫЯВІЛІ ШКОДНЫЯ РЭЧЫВЫ?

Рассельгаснагляд выявіў канцэраген бензапірэн у шпротах некаторых латвійскіх вытворцаў. Як паведамляе служба, пры правядзенні пагранічнага ветэрынарнага кантролю рыбных кансерваў у шпротах было выяўлена перавышэнне гранічна дапушчальнага ўзроўню канцэрагену бензапірэну. Гэта з'яўляецца парушэннем патрабаванняў заканадаўстваў Мытнага саюза і Расіі. Рассельгаснагляд растлумачыў, што бензапірэн небяспечны для чалавека нават у малой канцэнтрацыі, паколькі валодае ўласцівасцю назапашвацца ў арганізме. Аб тым, што здарылася, Рассельгаснагляд праінфармаваў тэрытарыяльныя ўпраўленні Расспажыўнагляду па Маскве і Маскоўскай вобласці з тым, каб небяспечная прадукцыя не была дапушчана да рэалізацыі. У рамках сваёй кампетэнцыі Рассельгаснагляд увёў рэжым узмоцненага лабараторнага кантролю за пастаўкамі гэтай прадукцыі. Лабараторным даследаванням падвергнулася прадукцыя прадпрыемстваў NA 007308, SIA Randa Klavas, Rojas pagasts, Rojas novads.

ВЫНОСЛІВАСЦЬ НЕ ГАРАНТУЕ АБАРОНУ АД ПРАБЛЕМ З СЭРЦАМ

Добрая фізічная форма ў падлеткавым узросце здольная знізіць рызыку сардэчных прыступаў у дарослым жыцці. Але не ўсё так проста. Паводле слоў навукоўцаў, неспартыўныя, худыя маладыя людзі больш абаронены ад праблем у параўнанні з поўнымі людзьмі, якія знаходзяцца ў добрай спартыўнай форме, піша Health India. Гэта паказаў аналіз 743 498 шведаў, якія праходзілі абследаванне ва ўзросце 18 гадоў. Пасля за ўдзельнікамі назіралі на працягу 34 гадоў, пакуль у тых не здараўся прыступ або яны памяралі. Такім чынам, добрая фізічная форма ў маладосці сапраўды зніжала рызыку сардэчнага прыступу. Але людзі з лішняй вагой, якія добра справіліся з тэстам на выносліваць, усё ж мелі значна павышаную рызыку ў параўнанні з худымі, фізічна невынослівымі людзьмі. Значыць, сама па сабе фізічная форма ні пра што не гаворыць.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АРЫЭЛЯ ШАРОНА ПАХАВАЛІ НА СЯМЕЙНАЙ ФЕРМЕ

Былы прэм'ер-міністр Ізраіля Арыэль Шарон быў пахаваны 13 студзеня на сямейнай ферме, размешчанай у пустыні Негеў на поўдні гэтай краіны, побач з магілай сваёй жонкі Лілі Шарон. На цырымонію былі дапушчаны толькі спецыяльна запрошаныя госці, паведамляе BBC News. Па дарозе з Ерусаліма на сямейную ферму картэж з целам нябожчыка спыніўся каля ўзгоркаў Латрун, дзе Шарон быў паранены ў 1948 годзе падчас вайны за незалежнасць Ізраіля. Там яму былі аддадзены апошнія воінскія ўшанаванні. Раней каля будынка Кнесета прайшло публічнае развітанне з палітыкам, на якім прысутнічалі ў тым ліку прэзідэнт Ізраіля Шымон Перэс, віцэ-прэзідэнт ЗША Джон Байдэн і спецпрадстаўнік па Блізкім Усходзе Тоні Блэр. Расію на цырымоніі прадстаўляў спікер Дзярждумы Сяргей Нарышкін.

Паколькі Шарон быў не толькі палітыкам, але і вядомым ваенным дзеячам, яго пахаванне праходзіла па правілах ваеннай цырымоніі. Труну з целам неслі восем генерал-маёраў. Акрамя таго, «прыкрывала» пахаванне батарэя ПРА «Жалезны купал». Для гэтага камандаванне ізраільскай арміі змяніла месцазнаходжанне комплексу тактычнай сістэмы, разгарнуўшы яго побач з ранча Шарона, якое, у сваю чаргу, знаходзіцца ў небяспечнай блізкасці ад мяжы з сектарам Газа.

КАРАТКА

Шматдзетныя сем'і Мінска, якія выхоўваюць пяць і больш дзяцей школьнага ўзросту, атрымаюць па дзве базавыя велічыні на кожнае дзіця для змяншэння бацькоўскай даплаты за пуцёўку ў лагер.

Інфляцыя ў Беларусі за 2013 год склала 16,5 працэнта.

У Беларусі мінімальная заработная плата за снежань 2013 года індэксуецца на 13,1 працэнта і складае Br1 млн 532 тыс. 230, пагадзінная мінімальная заработная плата — Br9 тыс. 160.

Не менш як 9 млн т збожжа плануецца сабраць у Беларусі ў 2014 годзе.

Легендарны збройны канструктар Міхаіл Калашнікаў за паўгода да смерці напісаў пакаянны ліст Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу, у якім раскайваўся за створаны ім аўтамат, які забраў жыцці мноства людзей ва ўсім свеце.

«Еўрабачанне-2014»: СКАЖЫЦЕ «СЫ-ЫР»!

Дэлегата ад Беларусі на міжнародны песенны конкурс зноў абралі са скандалам

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У ноч з пятніцы на суботу ў сценах Белтэлерадыёкампаніі адбыўся канцэрт фіналістаў нацыянальнага адборачнага тура конкурсу «Еўрабачанне-2014». Пераможцу тэлегледачы і журы выбіралі ў прамым эфіры. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на генеральнай рэпетыцыі і ўласна на шоу, каб параўнаць уражанні.

БЯСКОНЦЫ МЮЗІКЛ «ЛЮДЗІ Ў ЧОРНЫМ»

Першае, што ўразіла на папярэднім прагоне: практычна ўсе фіналісты выйшлі на сцэну ў чорных уборах! Хіба толькі Тэа радаваў вока тэракотавым пінжаком, ды гурт «Switter boys» і блізняты сёстры Кароль фарсілі ў бялютках касцюмах ды блакітных сукенках. Няўжо гала-канцэрт нацыянальнага адбору — настолькі сумная падзея? «Гэта ж толькі рэпетыцыя, можа, пераапрануцца», — выказала здагадку калега. Але і на шоу карцінка мала змянілася: 8 з 14 удзельнікаў дэманстравалі ўсе адценні чорнага...

На агульным фоне прыемна ўразіла Жанет. Пышная чорная сукенка падчас нумара «сцякала» са спявачкі, пакінуўшы тую ў белай туніцы, і ператварылася ў трох ці то ластавак, ці то кажаноў. «Мы прыдумалі гэты ўбор, на які пайшло амаль 30 метраў тканіны, і сам нумар літаральна за 5 дзён да новага года, — прызналася Жанет пасля выступлення. — Ідэя ў тым, што ўсе чорныя сілы саступаюць перад сілай кахання і дабрыні». І хоць сукенкі-трансформеры на «Еўрабачанні» дэманстраваліся неаднаразова, менш відовішчным нумар ад гэтага не стаў, а беларускі дызайнер Таццяна Давыдзенка спрацавала не горш за Юдашкіна.

СТАР. 8

«Шчасце — гэта вялікае майстэрства...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя таго, за высокія творчыя дасягненні і актыўны ўдзел у падрыхтоўцы дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013» падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена артысту-вакалісту (салісту) Маладзёжнага тэатра эстрады Вользе Вронскай, настаўніку танца, кіраўніку вакальна-харэаграфічнай студыі «Максі Брыз» мінскай сярэдняй школы № 202 Ганне Саковіч, намесніку галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 24» Белтэлерадыёкампаніі Вользе Саламаха.

За выдатныя творчыя дасягненні Гранд-прэмія і званне лаўрэата спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі прысуджана салісту эстрадна-вакальнай студыі «Залатыя галасы», бронзаваму прызёру дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013» Ільі Волкаву.

Заахвочвальныя прэміі спецфонду прысуджаны ўдзельнікам дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013» Кацярыне Арцем'евай, Іаланце Вярбіцкай, Мілене Вольскай, Дзіне Гейдаравай і Лейле Табатадзэ.

ЗАСНАВАНЫ ЮБІЛЕЙНЫ МЕДАЛЬ

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб устанаўленні юбілейнага медаля «70 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакументам зацверджаны Палажэнне аб юбілейным медалі, яго апісанне і ўзор пасведчання да яго. Гэтым юбілейным медалём будуць узнагароджвацца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былыя вязні фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месц прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны.

Акрамя таго, юбілейным медалём плануецца ўзнагароджваць замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія непасрэдна прымалі ўдзел у баявых дзеяннях за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Медаля таксама будуць удастойвацца ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Беларусі, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, работнікі дзяржорганаў і іншыя асобы, якія ўнеслі значны ўклад у гераіка-патрыятычнае выхаванне грамадзян Беларусі, увекавечанне памяці загінулых, арганізацыю мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

■ Выбары

ПАЗБЕГНУЦЬ РАНЕЙШЫХ ПАМЫЛАК

Самы эфектыўны спосаб — шляхам збору подпісаў

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў Беларусі 27-га склікання стартавала 12 студзеня і працягнецца па 10 лютага ўключна. Вылучаць кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў маюць права палітычныя партыі, працоўныя калектывы і грамадзяне шляхам збору подпісаў.

Сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК лічыць, што вылучэнне шляхам збору подпісаў з'яўляецца для кандыдатаў самым эфектыўным спосабам удзелу ў выбарчай кампаніі. Такое меркаванне ён выказаў журналістам у Віцебску падчас семінара па пытаннях арганізацыі, падрыхтоўкі і правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Самы лёгкі спосаб вылучэння, сказаў Мікалай Лазавік, — ад палітычных партый. Зарэгістраваная ў вобласці партыя можа вылучыць кандыдатаў па ўсіх 60 акругах абласнога Савета дэпутатаў. Працоўны калектыў можа вылучыць толькі аднаго кандыдата, і ў той акрузе, дзе знаходзіцца прадпрыемства.

Самы складаны спосаб — шляхам збору подпісаў. «Подпісаў хоць і няшмат трэба сабраць (у абласны Савет — 150, у раённы — 75, у сельскі і пасялковы — 20), але за імі трэба пахадзіць. Трэба сустрэцца з выбаршчыкамі, і тут могуць быць пэўныя складанасці. Але нараўне з імі ёсць і перавагі. Справа ў тым, што, збіраючы подпісы, ініцыятыўная група ўжо можа весці агітацыю. Афіцыйная агітацыйная кампанія пачынаецца пасля рэгістрацыі, але ж ніхто не забараняе агітаваць за свайго вылучэнца. Таму я раіў бы ўсім, хто мае намер вылучацца ў кандыдаты, хто рэальна хоча выбірацца, вылучацца менавіта шляхам збору подпісаў», — сказаў Мікалай Лазавік.

У той жа час на нарадзе ў Мінгарвыканкаме па пытаннях арганізацыі і правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА** заявіла, што на імідж выбараў вельмі дрэнна ўплываюць недакладныя спісы выбаршчыкаў.

— На жаль, як паказвае практыка папярэдніх кампаній, у спісах грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў, дубліруюцца ранейшыя памылкі, — сказала Лідзія Ярмошына. — Грамадзяне, не ўключаныя ў спісы на папярэдніх выбарах і ўключаныя ў дадатковыя спісы, не фігуруюць у новых спісах. І гэта прыводзіць да скандалаў, выклікае шмат скаргаў, а таксама нежаданне людзей ісці на выбарчыя ўчасткі. «Я пастаянна прашу прабачэння ў грамадзян за недакладнасць у спісах выбаршчыкаў. Усе чамусьці лічаць, што са спісамі робяцца нейкія маніпуляцыі», — дадала яна.

Старшыня ЦВК асаблівую ўвагу звярнула на неабходнасць паўнаты і дакладнасці спісаў. Пры гэтым, падкрэсліла Лідзія Ярмошына, нельга выкарыстоўваць спісы выбаршчыкаў, што былі на парламенцкіх выбарах, паколькі ў іх не былі ўнесены грамадзяне Расійскай Федэрацыі, якія маюць пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі і маюць права ўдзелу ў выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Гандаль

БЕЛАРУСЫ ЎПАДАБАЛІ ШОПІНГ

Беларусы сустрэлі Новы год весела і смачна. За апошнія месяцы 2013 года было пастаўлена 5,6 мільёна бутэлек шампанскага, а кандытарскія фабрыкі адгрузілі 1,7 мільёна «салодкіх» навагодніх падарункаў. З 20 снежня ў аб'ектах грамадскага харчавання сталіцы штодзённа святкавалі Каляды і Новы год 20 тысяч наведвальнікаў. Такія лічбы прадставіла Міністэрства гандлю, прэзентуючы папярэднія вынікі леташняй працы ведамства, у тым ліку арганізацый гандлю ў святочныя дні.

Гандлююць усе!

Вядомы вынікі і першага ў краіне адзінага дня зніжак, які прайшоў 29 снежня 2013 года. У гэты дзень крамы прапаноўвалі пакупнікам тавары са зніжкай у памеры 15-20% ад дзеючай цаны. Падчас акцыі колькасць пакупнікоў павялічылася больш чым у 2-3 разы ў параўнанні са звычайнай нядзеляй. А рознічны тавараабарот вырас у сярэднім па арганізацыях больш чым у 3 разы.

Аднак і без усялякіх акцый беларусы купілялі нядрэнна. «Гандаль забяспечыў найвялікшы ўклад з усіх галін у ВУП краіны. Без яго ВУП быў бы, хутчэй за ўсё, адмоўным», — заявіў Артур Карповіч, першы намеснік міністра гандлю. Доля гандлю ў ВУП склала 12,6%. У студзені—лістападзе 2013 года было забяспечана павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі практычна па ўсіх харчовых і нехарчовых таварах — 112,2% і 126,6% адпаведна да аналагічнага леташняга перыяду. Пры гэтым назіралася станоўчая дынаміка долі продажаў айчынных тавараў (рост з 70,9% да 71,7% ад рознічнага тавараабароту). Адбылося гэта ўсё, па словах Артура Карповіча, «на фоне нарастаючай жорсткай канкурэнцыі, у тым ліку ў межах Мытнага саюза».

Не дзіўна тады, што Міністэрства гандлю прыцягнула ў 2013 годзе прамыя замежныя інвестыцыі прыкладна на 300 млн долараў (другое месца пасля прамысловасці — 534,6 млн). Пры гэтым на пачатку года меркавалася, што гэтая лічба будзе ўдвая меншай. «Сёння ў гандлёвую сферу ахвотна ідуць замежныя інвестыцыі», — адзначыў Артур Карповіч. Паводле яго слоў, замежныя інвестыцыі ідуць перш за ўсё ў будаўніцтва гандлёвых комплексаў і аб'ектаў. Так, колькасць магазінаў павялічылася на 1043, гандлёвых цэнтраў — на 17.

Звяртайце ўвагу на тэрмін прыдатнасці

Асаблівая ўвага ў другой палове 2013 года надавалася міністэрствам парадку на спажывецкім рынку, у тым ліку ў сеткавых крамах. «Па выніках планавых і нясланавых праверак больш чым 1300 аб'ектаў, парушэнні, на жаль, установлены амаль у кожным (96%). Напрыклад, вынікі кантрольных мерапрыемстваў у крамах сеткі «Еўраопт» паказваюць, што ў кожным трэцім гандлёвым аб'екце з ліку праверaных рэалізоўваўся пратэрмінаваны тавар. У крамах сеткі «Рублёўскі» ўстаноўлена, што ў 80% гандлёвых аб'ектаў рэалізоўваўся тавар са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Не лепш справы і ў фірменных крамах птушкафабрык. У 25 крамах з 29 праверaных знаходзіўся пратэрмінаваны тавар. Гэта крамы ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка», РУП «Беларуснафта», ААТ «1-я Мінская птушкафабрыка» і іншыя», — пералічыў парушальнікаў першы намеснік міністра. Але тут жа зрабіў агаворку: «Але гэта не значыць, што нельга хадзіць у крамы. Гэта толькі адзінкавыя выпадкі, і іх становіцца ўсё менш. Проста заўсёды правярайце тэрмін прыдатнасці. А пра ўсе парушэнні можна паведаміць па спецыяльным «тэлефоне даверу» Мінгандлю — 200-92-02. Усе недахопы і прапановы па працы аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва любы ахвотны можа выказаць абсалютна ананімна. Кожны падобны зварот улічваецца пры назначэнні і правядзенні праверак».

Усе недахопы і прапановы па працы аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва любы ахвотны можа выказаць абсалютна ананімна па «тэлефоне даверу» Мінгандлю — 200-92-02.

Між іншым, найбольш распаўсюджаныя парушэнні (акрамя наяўнасці пратэрмінаванай прадукцыі) — гэта невыкананне асартыментных пералікаў, адсутнасць інфармацыі аб вытворцах, даце вырабу, умовах і тэрміне захоўвання, невыкананне парадку афармлення цэннікаў, адсутнасць кантрольных вагаў, невыкананне рэжыму працы і гэтак далей. Былі складзены 902 пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях, па якіх прадугледжваецца прымяненне штрафаў на суму звыш 6 млрд рублёў.

Рэкламы! Больш рэкламы!

Міністэрства гандлю вельмі хвалюе рэкламаванне айчынных тавараў. «Цяпер міністэрствам распрацоўваецца праект Канцэпцыі развіцця рэкламнага рынку Беларусі на 2014—2020 гады, дзе прадугледжаны мерапрыемствы па нарошчванні аб'ёмаў рэкламы айчынных вытворцаў, — паведаміў Артур Карповіч. — Апошнім часам яны і так павялічваюць выдаткі на рэкламу прадукцыі, разумеючы, што рэклама — гэта рухавік гандлю. За 9 месяцаў 2013 года айчынныя вытворцы і прадпрыемствы гандлю ў цэлым выдаткавалі на рэкламу 609 млрд рублёў, што на 216 мільярдаў перавышае паказчык за аналагічны перыяд 2012 года. Аднак калі харчовая прамысловасць і гандаль павялічылі выдаткі на рэкламу амаль у 2 разы, то для тэкстыльнай, швейнай, дрэваапрацоўчай прамысловасці гэта не характэрна».

На ЧС-2014 будуць прадавацца і беларускія сувеніры

«Падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі-2014 да продажу будуць дапушчаны 26 найменняў і 87 разнавіднасцяў тавараў беларускай вытворчасці з сімволікай чэмпіянату», —заявіла Ніна Пашко, начальнік упраўлення спажывецкага рынку нехарчовых тавараў Міністэрства гандлю. Гэта календары на тэкстыльнай аснове, сшыткі, альбомы для малявання, драўляныя скрыначкі, масленіцы, мыла, камплекты для саўны, лазні. Іх рэалізацыя абмяжоўваецца толькі ў фан-зонах і спартыўных арэнах. Як паведамлялася раней, Міжнародная федэрацыя хакея заключыла кантракт са шведскай фірмай, якая стане эксклюзіўным вытворцам сувенірнай прадукцыі. Вызначаны пералік тавараў беларускіх вытворцаў з сімволікай (відарысам эмблемы і талісмана) чэмпіянату, якія да 9 лютага неабходна выключыць з продажу. Беларуская прадукцыя зможа вярнуцца на прылаўкі толькі 25 мая. Усяго забарона ўстаноўлена на рэалізацыю 56 найменняў і 188 разнавіднасцяў нехарчовых тавараў.

Tax-free працуе

Летась наша краіна першай сярод дзяржаў СНД укараніла сістэму вяртання падатку на дабаўленую вартасць Tax-free. Аднымі з першых да яе падключыліся буйныя ўнівермагі сталіцы «ГУМ», «ЦУМ», «Беларусь», «ГД «На Нямізе». Гэтай паслугай ужо скарысталіся больш за 200 замежнікаў з 42 краін — Германіі, Кітая, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Эквадора, ЗША, Ізраіля, Італіі, Нарвегіі, Турцыі і іншых. Агульная сума аформленых чэкаў Tax-free на 4 студзеня склала 620 млн беларускіх рублёў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Ваш кашалёк

ЯК ЗМЯНЯЛІСЯ ЦЭНЫ Ў 2013-м

Цэны на харчовыя тавары ў Беларусі ў снежні 2013 года выраслі на 2,2 працэнта ў параўнанні з лістападам, адносна снежня 2012-га яны павялічыліся на 13,4 працэнта. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У снежні ў параўнанні з папярэднім месяцам зноў патаннеў алей — на 1,3 працэнта. Цана на цукар чарговы раз засталася на былым узроўні.

Менш чым на 1 працэнт падаражэлі каўбасныя вырабы і вэнджаніна (на 0,4 працэнта), алкагольныя напоі (на 0,7 працэнта). Больш за ўсё ў снежні мінулага года падаражэла агародніна — на 15,7 працэнта, бульба — на 11,3 працэнта, пшанічная мука — на 7,8 працэнта, а таксама яйкі — на 6,3 працэнта.

Цэны на нехарчовыя тавары ў снежні ў параўнанні з лістападам павялічыліся на 0,8 працэнта, са снежнем 2012 года — на 7,6 працэнта. У гэтай групе тавараў не адбылося вялікіх змяненняў цэн. Бензін падаражэў на 4,6 працэнта, веласіпеды і матацыклы — на 1,4 працэнта. На 1 працэнт выраслі цэны на медыкаменты. На астатнія тавары падаражанне склала менш чым 1 працэнт.

Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў снежні ў параўнанні з лістападам склаў 104,9 працэнта, са снежнем 2012 года — 139,1 працэнта. Цэны на паслугі сувязі павялічыліся на 0,9 працэнта, на медыцынскія паслугі — на 1,3 працэнта, турыстычныя — на 2,4 працэнта, паслугі культуры — на 2,8 працэнта. Бытавыя паслугі падаражэлі на 3,1 працэнта, санаторна-аздараўленчыя — на 3,9 працэнта. Цэны на жыллёва-камунальныя паслугі выраслі на 8,1 працэнта. Паслугі пасажырскага транспарту сталі даражэйшымі на 14 працэнтаў. Не змяніўся кошт паслуг вышэйшай адукацыі, а таксама паслуг дашкольных установ.

У цэлым у Беларусі індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў снежні 2013 года ў адносінах да лістапада склаў 102,4 працэнта, да снежня 2012-га — 116,5 працэнта. У студзені 2013 года цэны выраслі на 3 працэнты, у лютым — на 1,2 працэнта, сакавіку — на 1,1 працэнта, красавіку — на 0,5 працэнта, маі — на 0,7 працэнта, чэрвені — на 0,3 працэнта, ліпені — на 1 працэнт, жніўні — на 0,1 працэнта, верасні — на 1,7 працэнта, у кастрычніку — 1,9, у лістападзе — 1,6 працэнта.

■ Навіны сталіцы

У Мінску з'явілася вуліца Агінскага

Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў рашэнне аб прысваенні найменняў шэрагу састаўных частак сталіцы. Адпаведнае рашэнне № 386 ад 23 снежня 2013 года апублікавана ўчора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БЕЛТА.

Так, вырашана прысвоіць парку ў межах вуліц Каменнагорскай, Лідскай, Калеснікава, Казіміраўскай найменне парк імя Уга Чавеса.

Акрамя таго, у мікрараёне Магістр замест праектуемай вуліцы № 1 з'явіцца вуліца Агінскага, праектуемай вуліцы № 2 ад праектуемай вуліцы № 1 да вуліцы Кірылы Тураўскага — вуліца Ільі Капіевіча. Праектуемая вуліца № 3 будзе называцца вуліцай Акадэміка Высоцкага. У гэтым жа мікрараёне праезд ад праспекта Незалежнасці да праезду перад лесапаркавай зонай стане праездам Універсітэцкім. Праезд № 3 будзе называцца вуліца Навуковая.

У мікрараёне Сокал праектуемая вуліца № 13 будзе называцца вуліцай Антоненкі, праектуемыя вуліцы № 15 і № 16 аб'ядналі ў вуліцу Дакутовіч, праектуемая вуліца № 17 стане вуліцай Шацілы, праектуемая вуліца № 7 у межах вуліц Малы Трасцянец і Зарэчная — вуліцай Дукорскай.

«ТОЕ, ЯК МЯНЕ ТУТ ПРЫМАЮЦЬ, ПЕРАСЯГНУЛА ЎСЕ МАЕ ЧАКАННІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мітрапаліт Філарэт за свае архіпастырскія гады вырасціў тут добры духоўны вінаградник. Таму мая задача — працягваць клапаціцца пра гэты вінаградник, акармляць яго. Будзем спадзявацца, што ўладыка Філарэт, калі аправіцца ад сваёй хваробы, будзе мне добрым памочнікам, пра што мы заўсёды молімся.

«Я шчыра радуюся таму, што сёння нашы праваслаўныя храмы напаўняюцца і дзеткамі, і дарослымі, і нават казакі сёння з намі моляцца ў гэтым храме. Мне хочацца, каб гэтак жа, як сёння, і кожны дзень у будучым нашы храмы напаўняліся, і нашы людзі станавіліся поўнымі пашаны да Бога праваслаўнымі хрысціянамі.

Мы сёння маліліся за Уладыку Філарэта, і я ўсіх вас прашу таксама ўзносіць свае малітвы і дома, і ў храме, бо для кожнага з нас Уладыка Філарэт — добры настаўнік, малітоўнік... чалавек, які жыве з малітвай...

Для мяне Уладыка Філарэт з'яўляецца духоўным настаўнікам, бо на працягу многіх гадоў я нёс паслушэнства пад яго кіраўніцтвам у рускай духоўнай місіі ў Іерусаліме, калі ён быў кіраўніком аддзела знешніх царкоўных зносін. Мы ўсе яго ведаем як аднаго з самых шаноўных архіпастыраў у Рускай праваслаўнай царкве, таму хочацца пажадаць, каб яшчэ доўгія гады ён быў нашым паплечнікам, каб усім нам дапамагаў сваім словам, падтрымкай і мудрасцю, якой Гасподзь надзяліў яго асабліва.

...У гэтыя святочныя дні я ва ўсіх храмах, дзе служу, усім перадаю патрыяршае благаслаўленне. Святейшы Патрыярх Кірыл, калі даваў наказ мне на новае служэнне ў Рэспубліцы Беларусь, казаў: «Уладыка, я вельмі люблю Беларусь, вельмі люблю народ Беларусі і ўпэўнены, і вы палюбіце гэты набожны добры народ. Шматпакутны народ, які многа пацярпеў, але захаваў веру ў Бога».

«Уладыка, — казаў ён мне, — вы едзеце ў добрую краіну, якая працвітае і дзе пражываюць годныя людзі». І я ўжо сапраўды ў гэтым упэўніўся і радуюся таму, што звяртаюся з вамі, і буду спадзявацца, што Гасподзь благаславіць усіх нас і мы будзем доўгія гады разам маліцца, працаваць, бачыць адно аднаго і жадаць адно аднаму толькі добрае і вечнае.

І карыстаючыся магчымасцю, хачу яшчэ раз усім пажадаць, каб новы каляндарны год, які наступіў, для кожнага з нас быў годам блаславенным, мірным, каб Гасподзь усіх нас благаслаўляў добрым здароўем». ***(З пропаведзі мітрапаліта Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі ў сталічным прыходзе іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» 10 студзеня 2014 года).***

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Гэтыя 10 дзён сапраўды былі вельмі насычаныя для новага Экзарха. Ён прыляцеў у Мінск 4 студзеня і ўжо ў гэты дзень узначаліў малебен у галоўным праваслаўным храме сталіцы, наведаў Духоўна-адукацыйны цэнтр Беларускай праваслаўнай царквы, Епархіяльнае ўпраўленне. Для сваёй рэзідэнцыі Патрыяршы Экзарх абраў Мітрапаліцкую гасціную пры Доме міласэрнасці.

На наступны дзень, 5 студзеня 2014 года, мітрапаліт Павел здзейсніў у Свята-Кафедральным саборы сваю першую літургію на Беларусі. У другой палове дня ён сустрэўся з епіскапатам. Шостага студзеня прадстаяцель пасля навячэр'я і літургіі наведаў у бальніцы мітрапаліта Філарэта, увечары ўзначаліў усяночнае трыванне. У сам дзень Раства Хрыстовага Уладыка Павел зноў узначаліў святочную літургію ў кафедральным саборы, потым — сустрэча з кіраўніком дзяржавы, увечары — святочнае набажэнства. За гэтыя дні ён здзяйсняў урачыстыя літургіі ў сталічных Свята-Аляксандра-Неўскім храме, Ефрасіннеўскім храме прыхода іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць», Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы, Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра і Міхаілаўскім кафедральным саборы Слуцка. Мітрапаліт Павел віншаваў дзяцей на галоўнай дзіцячай ёлцы краіны, удзельнічаў у цырымоніі ўзнагароджання дзяржаўнай прэміяй «За духоўнае адраджэнне», віншаваў з Раством работнікаў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення і яшчэ раз наведаў свайго папярэдніка мітрапаліта Філарэта, за здароўе якога ён падчас кожнага набажэнства просіць вернікаў памаліцца асобна. І пасля кожнага набажэнства падчас цалавання крыжа Патрыяршы Экзарх адорвае дзяцей прасфорамі і шакаладкамі.

Калі ў Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы нейкая жанчына падчас цалавання крыжа сказала, што ў яе сёння дзень нараджэння, мітрапаліт Павел спачатку гучна спытаў прыхаджан, ці ёсць яшчэ імяніннікі ў храме, прапанаваў усім спець у гонар імянінніцы «Доўгая лета» і падарыў шчаслівай жанчыне букет кветак...

■ Цікава

ЗЯМЛЮ НАКРЫЛЕ МЕТЭАРЫТНЫ «СНЕГ» КАМЕТЫ ISON

У ноч на 14 студзеня да Зямлі даляціць касмічны пыл ад мегакаметы «Айсон» (ISON), якая распалася ў снежні, наблізіўшыся да Сонца. Рэдкая з'ява ў атмасферы Зямлі чакаецца сёння і ў бліжэйшыя некалькі дзён, паведамляюць інфармагенцтвы.

Нагадаю, што летась камета Айсон разляцелася на часткі з-за збліжэння з Сонцам. Мільёны тон рэчыва апынуліся ў касмічнай прасторы, і цяпер частка гэтага касмічнага смецця знаходзіцца на шляху Зямлі. Зрэшты, паводле сцвярджэнняў астраномаў, прыгожага відовішча не будзе, бо драбнюткія часціцы будуць проста плаўна апускацца на Зямлю ў атмасферы планеты, пакуль не дасягнуць яе паверхні. Але гэты «снег» з рэшткаў кометы ўсё ж можа стварыць над планетай цікавыя з'явы — напрыклад, серабрыстыя аблокі або рабізну, якія хутчэй за ўсё можна будзе ўбачыць над полюсамі Зямлі.

А тым часам астраномы ва ўсім свеце назіраюць за кометай Лаўджоя, якая праходзіць паблізу ад Зямлі толькі раз у 7000 гадоў. Камету асабліва добра відаць ва ўсходняй частцы неба ў раніш-ні час. Касмічная падарожніца адрозніваецца сваёй унікальнай зялёнай афарбоўкай. Яна мае незвычайна доўгі хвост. Зялёны арэол вакол кометы абумоўлены выпарэннем вады з яе паверхні пры раставанні нябеснага цела ад уздзеяння Сонца.

Сяргей КУРКАЧ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

УНП 600013173

ОАО «Минскоблхлебопродукт»

извещает, что 24 января 2014 года
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4. Начало собрания в 13.00.
Регистрация акционеров с 12.30.

При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

О даче согласия на увеличение доли Республики Беларусь в уставном фонде открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт». *Тел. 224-19-17.*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

СМАРТ-ТЭХНАЛОГІІ Ў ТРАМВАІ

З 1 лютага пасажыры сталічных трамваяў пакінуць у мінулым звыклыя папяровыя праязныя. Іх заменяць спецыяльныя электронныя праязныя на аснове бескантактных смарт-картак.

Па інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», набыць новыя праязныя можна будзе ўжо з 15 студзеня. У продаж паступяць карткі з тэрмінам дзеяння 10, 15 дзён і 1 месяц.

Пры ўваходзе ў трамвай уладальнік смарт-карткі павінен прыкласці яе да валідатара (спецыяльнае прыстасаванне, прымацаванае на парэнчах). Адразу пачуецца гукавы сігнал, які азначае, што праезд аплачаны. Калі ў транспарт зойдуць кантралёры, і валідатары, і электронныя кампосцеры, з дапамогай якіх пасажыры трамваяў цяпер павінны прабіваць аднаразовыя талоны, будуць адразу блакіравацца. Падчас пакупкі новага праязнога ў першы раз давядзецца аддаць дадатковых 12 тысяч рублёў — гэта залогавы кошт карткі. Пакуль што праязны на яе аснове не сумяшчае ў сабе права праезду на некалькіх відах транспарту, абмяжоўваючыся толькі трамваем, але, як паведамляюць у «Мінсктрансе», у пачатку вясны электронныя кампосцеры і валідатары павінны з'явіцца ва ўсіх гарадскіх аўтобусах і тралейбусах.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

СУСТРЭНЕМСЯ НА «ВІЦЕБСКАЙ СНЯЖЫНЦЫ»

Танцавальныя пары з Беларусі, а таксама краін блізкага і далёкага замежжа возьмуць удзел у XXIX Міжнародным конкурсе па спартыўных бальных танцах «Віцебская сняжынка». Свята танца адбудзецца 18-19 студзеня ў канцэртнай зале «Віцебск».

— Гэты беларускі конкурс сусветнай класіфікацыі WDSF сярод прафесіяналаў лічыцца адным з самых прэстыжных у свеце. Удзельнікі выступяць у васьмі узроставых катэгорыях: як маленькія танцоры ва ўзросце ад 5 гадоў, так і вопытныя пары, у тым ліку і міжнароднага ўзроўню майстэрства. Кожная пара прадставіць па дзве танцавальныя праграмы — еўрапейскую і лацінаамерыканскую.

Для ацэнкі выступленняў канкурсантаў запрошаны суддзі з Азербайджана, Беларусі, Іспаніі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Славеніі, Расіі, Турцыі, Украіны, Фінляндыі, Швейцарыі, Эстоніі, — паведамілі ў арганізацыйным камітэце конкурсу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕНАЎМЫСНЫ СУІЦЫД

У Магілёве міліцыянеры вярнулі мужчыну... з таго свету.

Спачатку ўсё было звычайна: спрацавала ахоўная сігналізацыя на адным з аб'ектаў гаражнага масіву «Хімвалакно-2» і супрацоўнікі Кастрычніцкага (г. Магілёва) аддзела Дэпартамента аховы ў складзе прапаршчыка Андрэя Кісялёва і малодшага сяржанта Дзмітрыя Кузняцова выехалі на праверку. А далей сюжэт разгортваўся як у сапраўдным дэтэктыве.

Як паведаміў старшы інспектар Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС маёр міліцыі Яўген Паўлюк, на месцы міліцыянеры ўбачылі, што дзверы гаража прыадчынены. Калі яны заглянулі ўнутр, то заўважылі мужчыну, які відаць на вяроўцы і не падаваў ніякіх прыкмет жыцця. Але супрацоўнікі аддзела аховы не разгубіліся і кінуліся ратаваць «мерцвяка» шляхам правядзення закрытага масажу сэрца і штучнага дыхання. Іх намаганні мелі поспех. Малады чалавек, які ледзьве не скончыў свой жыццёвы шлях у 30 гадоў, потым прызнаўся, што зусім не збіраўся накладаць на сябе рукі. У гараж прыйшоў, каб прывесці ў парадак нейкія звычайныя справы, а калі іх скончыў і нават паставіў гараж на сігналізацыю, неадкуль прыйшло жахлівае жаданне сысці з жыцця. Сігналізацыя аказалася тым самым ратавальным сродкам, на які ён нават і не разлічваў. Але, калі б не рашучыя дзеянні неабыякавых міліцыянераў, усё магло скончыцца не так аптымістычна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

СТАНУЦЬ УДВАЯ БОЛЬШ ШЧАСЛІВЫМІ

У Полацкім раёне будучыя муж і жонка ў гэтыя дні маюць магчымасць стаць удвая больш шчаслівымі.

— Да 19 студзеня 2014 года ў аддзеле ЗАГС Полацкага райвыканкама будзе праходзіць акцыя «Хто дорыць шчасце — шчаслівы ўдвая больш». Пры падачы маладымі пашпартоў за тыдзень да афіцыйнай рэгістрацыі шлюбу ў аддзеле ЗАГС Полацкага райвыканкама ім прапануюць паўдзельнічаць у навагодняй дабрачыннай акцыі. Маладыя ва ўрачысты дзень рэгістрацыі маюць магчымасць падзяліцца сваім шчасцем і падарыць малазабяспечанай сям'і навагодні падарунак пад навагоднюю ёлку са сваімі пажаданнямі. Сям'я, якой будзе ўручаны падарунак, выбіраецца будучымі мужам і жонкай шляхам латарэі (на ёлачных шарах напісаны прозвішчы бацькоў, імёны і ўзрост дзяцей, адрас пражывання. — **Аўт.**), — паведамілі ў Полацкім райвыканкаме.

Пасля завяршэння акцыі арганізатары — «Беларускі саюз жанчын» сумесна з аддзелам ЗАГС, камісіяй па справах непаўналетніх Полацкага райвыканкама — запросяць малазабяспечаныя сем'і на гарбату. Кожнай будуць уручаны адрасаваныя ім навагоднія падарункі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«МАЗ» СПЫНІЎ ДОМ

У Віцебску «МАЗ» урэзаўся ў шматкватэрны жылы дом.

— Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў абласным цэнтры а дзявятай гадзіне раніцы на вуліцы Розы Люксембург. Вадзіцель грузавіка не справіўся з кіраваннем, аўтамабіль сутыкнуўся з пяціпавярховым жылым домам. Будынак не пашкоджаны, сярод жыхароў пацярпелых няма, — паведаміла Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

Вадзіцеля «МАЗ» выратавальнікі выцягнулі з кабіны. Пацярпелага, які атрымаў траўмы, шпіталізавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕНСІЯНЕР ПАВІС УНІЗ ГАЛАВОЙ

У Смалявіцкім раёне выратавальнікі знялі з апоры лініі электрапередач пенсіянера.

— Удзень пра тое, што на апоры паблізу вёскі Ізбіцкае ўніз галавой вісіць чалавек, якому патрэбна дапамога, паведаміў выпадковы сведка, — распавялі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — На месцы з вышыні чатырох метраў пры дапамозе лесвіцы нашы работнікі знялі мужчыну 1950 года нараджэння. Мяркуецца, што пенсіянер быў нападпітку. Падчас высвятлення абставін здарэння было ўстаноўлена, што мужчына спрабаваў самастойна ачысціць электрычныя правады, якія акісліліся, заблытаўся ў дроце, не ўтрымаўся і павіс уніз галавой на апоры. Не дачакаўшыся брыгады хуткай медыцынскай дапамогі, пацярпелы з'ехаў з месца здарэння са знаёмым.

Сяргей РАСОЛЬКА.

В суд Речицкого района поступило заявление об объявлении умершим гражданина КОПУСОВА Сергея Антоновича, 7.05.1959 года рождения, уроженца г. Речица Гомельской области, проживавшего по адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Сенькина, д. 7, кв. 37, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить суду Речицкого района в течение двух месяцев после публикации имеющиеся сведения о Копусове Сергее Антоновиче.

■ Лініі жыцця

НАВАГОДНІ СЮРПРЫЗ

...Тэлефон, як гэта бывае апоўначы, зазваніў гучна. Каця пасля цяжкага працоўнага дня якраз ляжала ў цёплай ванне і цешыла сябе тым, што заўтра выхадны і што сын, дасць Бог, паспіць крыху даўжэй...

А тэлефон надрываўся. «Вось жа прыспічыла некаму, разбудзіць Жэньку!» — шкадуючы, што не адключыла апарат, падумала Каця, накінула старэнькую прасціну, ціха, але злосна прашыпела:

— Ало...

— Ало! Ало!.. Калі ласка, не кладзіце трубку. Ваш тэлефон 42555? — прыемны мужчынскі голас заварожваў, і Каця прытоена слухала. — Вас завуць Ленай?.. Мне так прыснілася, разумееце? Я вырашыў набраць... Колькі вам гадоў?

— 19, — у тон яму, адказала Каця.

— І вы не замужам? Ну гэта ж лёс! Давайце знаёміцца. Я — Вадзім. Мне — 22... Жыву ў Мінску, але сёння тут — у мамы. І раптам — гэты сон... Лена, давай — на «ты», згодна?

— Згодна, але ўжо позна, я не магу размаўляць (з мокрых валасоў капала халодная вада). — Бывай...

— Добра, бывай, але я пазваню табе, можна? Мы павінны сустрэцца!

Каця сцепанула плячыма, паклала тэлефонную трубку. Вяртацца ў ванну ўжо не хацелася. Высушыла валасы, нацягнула піжаму, цмокнула ў рыжовую ад сну шчочку сына і ціхенька прылегла на свой ложак. Усміхнулася: «Дзівак... Гэта лёс... Лена, Леначка, мы павінны...» — Кацю забіраў смех — яна заціскала рот рукой, аж пакуль не пацяклі слёзы.

Плакала да знямогі, а потым ляжала — паспакайнелая, нібы апустошаная.

Дзевятнаццаць... У дзевятнаццаць усё і пачалося. Закахалася, дурніца, нічога не бачыла і не чула, «купалася» ў ясных прыгожых вачах, аж пакуль не ўтапілася... Колькі сораму потым вынесла, калі кінуў... Родная цётка, бацькава сястра, і тое сказала: «Дзякуй Богу, бацькі не дажылі — гэтай ганьбы не зведалі...».

Скамянела тады, выплакаўшы слёзы. На родзе мужчынскім паставіла кропку.

Ды трэба ж — хлопчык нарадзіўся: яе маленькае сонейка, яе надзея.

Назвала ў гонар дзядулі — Жэнькам. Ад работы далі аднапакаёўку, крыху дапамаглі грашыма, адтала сэрца і ў цёткі. А следам пацяклі будні — з радасцямі, бедамі, хваробамі. Хлопчык падрос, — аддала ў садок, зноў выйшла на працу, на пошту. Там заўжды віраваў народ, усім было нешта трэба... І Каця не лічылася з часам, любіла дапамагаць... Людзі паважалі яе і часцяком штось смачнае перадавалі Жэньку, што спачатку вельмі бянтэжыла... А потым яна прывыкла.

Беглі месяцы, нават гады, амаль нічога ў яе жыцці не мяняючы. Так балюча апёкшыся, Каця зусім не зважала на мужчын, хоць з іх боку ўвагі хапала. Пасля родаў яна папрыгажэла, адгадавала касу... І хлопчык яе вельмі радаваў: рос кемлівым, жвавым. Ён ведаў, што таты ў яго няма. І таму сам стараўся быць мужчынам: дапамагаў маме несці сумку, падстаўляў крэсла, абуваў. Нават спрабаваў варыць ёй каву, гаварыць кампліменты. Любіў абняць за шыю, прытуліцца, сказаць: «Ты ў мяне самая-самая — самая лепшая, самая прыгожая!».

...Блізіўся Новы год. Жэнька марыў пра канькі. Каця загадзя «збірала» грошы, бо трэба ж парадаваць малога. І працавала штодзень да позняга: назаўтра, пакуль дабралася дадому, сын ужо соладка спаў. Каця таксама збіралася легчы раней, як зноў зазваніў тэлефон.

— Леначка, добры вечар! Дзе ты прападала цэлы дзень? Я непакоіўся.

Яны гаманілі, гаманілі, гаманілі: размаўляць з Вадзімам было вельмі цікава і лёгка. Каці здавалася, што вяртаецца маладосць. Бянтэжыла адно: яна хлусіла яму, казала няпраўду.

Да Новага года заставаўся тыдзень. Каця яшчэ больш папрыгажэла, вочы яе ззялі шчасцем. Здаецца, яна закахалася. Але ж адчувала, што паводзіць сябе так нельга. «Сёння ж усё раскажу, — вырашыла яна, — досыць ілюзій, не трэба забіваць хлопцу галаву».

Аднак «хлопец» ні сёння, ні назаўтра ёй не пазваніў. Што ж, так ёй і трэба — значыць, ён нешта адчуў ці нават даведаўся. Гэта ж па сённяшнім часе проста, варта захацець...

У апошні дзень старога года Каця рушыла ў краму — па канькі. Ішла хутка, не зважаючы на людзей, на машыны.

— Кацюша, добры вечар, з надыходзячым! — данеслася з той што амаль спынілася побач. — Сядайце, падвязу.

— Дзякуй, мне блізка. Я люблю хадзіць пешкі. Да таго ж ніколі не езджу з незнаёмцамі.

— Мама, мама, сядай, — з-за спіны ў кіроўцы пачуўся голас сына.

— Жэнька?! — аслупянела Каця. — Як ты тут апынуўся?

— Не, ты лепей глянь, якія ў мяне канькі!

— Адкуль? — аднымі вуснамі спытала яна.

— Каця, давай знаёміцца! Я — Вадзім. З Новым годам! Вось — кветкі... Мой першы падарунак.

...Каця не помніла, як апынулася ў машыне. Вадзім пяшчотным позіркам лашчыў яе твар і ладную фігуру, ціхенька пасміхаўся, а вось Жэнька — той прыспешваў:

— Хутчэй, хутчэй паедзем, нас чакае бабуля. У яе — ёлка, торт і цукеркі...

— Якая бабуля? Як ты мяне знайшоў? — Каця глянула ў вочы Вадзіму і сумелася.

— Знайшоў... Дапамог наш сынок. Ён вельмі кампанейскі... Але ж на самой справе: паедзем хутчэй, нас чакае мама. Унука яна ўжо бачыла, зараз чакае нявестку...

Людміла БАБРОЎСКАЯ,
г.п. Падсвілле

Людзі, якія захоўваюць спадчыну

Гавораць лаўрэаты спецпрэмій Прэзідэнта ў галіне культуры і мастацтва

Днямі прайшло ўручэнне спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў галіне культуры і мастацтва. Усяго было ўручана 10 прэмій прадстаўнікам творчых прафесій з усёй краіны. «Звязда» пацікавілася ў некаторых, якое значэнне для іх мае прэмія і за якія дасягненні яны яе атрымалі.

Аўтарскі калектыў з Віцебска ў складзе членаў Беларускага саюза мастакоў Тацяны і Юрыя Рудэнкаў быў узнагароджаны спецпрэміяй за высокія дасягненні ў галіне выяўленчага мастацтва і актыўную выставачную дзейнасць. Пра дасягненні творчага тандэма распавядае **Таццяна РУДЭНКА:**

— Наогул, нас вельмі цэняць улады Віцебска, наколькі я ведаю. Мы з мужам — аўтары вельмі многіх работ для горада. Раней муж рабіў прызы для «Славянскага базару». Гэта былі аб'ёмныя скульптуры сантыметраў 60 у вышыню: пад шкляным каўпаком краявіды горада, ваблошкі... Такі прыз — сапраўдная мастацкая каштоўнасць, і трэба было атрымліваць спецыяльны дазвол на вываз такога прыза. Ён рабіў прызы і для найлепшых журналістаў, якія асвятлялі падзеі «Славянскага базару». Гэта было такое металічнае пяро ў 40 сантыметраў, інкруставанае каштоўнымі камянямі. У нас шмат праектаў па Віцебску, Віцебскай вобласці. Самы вялікі мы зрабілі памерам 250 квадратных метраў. Таму, безумоўна, нас улады цэняць.

Цяпер адказнасць творчых людзей вельмі высокая. Таму што мастацтва — гэта адзіны канал, праз які духоўнасць ідзе да людзей. Мы з'яўляемся лекарамі душ. І ад таго, якімі будуць нашы лекі, будзе залежаць і здароўе грамадства.

І потым, летась у мужа быў юбілей — 60 гадоў. І тады ж мы зрабілі на «Славянскім базары» вялікую выставу «Толькі вечныя каштоўнасці» з нашымі іконамі, габеленамі, дробнай пластыкай. Усяго больш за 100 нашых твораў. У мяне ікона Благавешчання з Храма Гроба Гасподняга, з Храма 12 апосталаў з Ізраіля... Там мой духоўны бацька. Я да гэтага ішла доўга, рыхтавалася. На выставе было прадстаўлена 30 ікон. Выстава працягвалася 4 месяцы ў Віцебску, яе не здымалі. І вось неяк так нас заўважылі і вырашылі адзначыць нарэшце. Хаця ў нас заўсёды шмат было грамат, заўжды нас заахвочвалі. Потым наша выстава пераехала ў Мінск, у Нацыянальны мастацкі музей. І таксама была ўсімі ўхвалена, як мне перадалі.

Выстава называлася «Толькі вечныя каштоўнасці», таму што мы так настроены. Кожны чалавек павінен не толькі жыць для сябе, а жыць яшчэ і для дзяржавы, прыносіць ёй карысць. Цяпер адказнасць творчых людзей вельмі высокая. Таму што мастацтва — гэта адзіны канал, праз які духоўнасць ідзе да людзей. Мы з'яўляемся лекарамі душ. І ад таго, якімі будуць нашы лекі, будзе залежаць і здароўе грамадства. Я так разумею сваю задачу. Таму нашы творы — духоўныя: аб прыродзе, любові, духоўнасці.

За пераклад на беларускую мову кнігі «Пад крыламі Дракона. Сто паэтаў Кітая» ўганараваны прэміяй галоўны рэдактар рэдакцыі часопіса «Полымя» выдавецкага дома «Звязда» **Мікола МЯТЛІЦКІ.**

— Гэтая прэмія для мяне азначае перамогу нашага холдынга! Тое, што мы зарыентаваны на лепшыя кнігі! І тое, што мы жывём адкрыццём іншых краін і літаратур, мы застаёмся ў кантэксце літаратур свету. Кітайская цывілізацыя — гэта найвялікшая цывілізацыя свету, гэта цывілізацыя, якая не перарывалася ніколі! Пачынаючы з гістарычна вядомых шумераў, працягваючы грэкамі і рымлянамі — усе цывілізацыі свету перарываліся. Кітайская цывілізацыя мае паступовы наступ. І самае дзіўнае адкрыццё — што паэзія Кітая стваралася самымі адукаванымі людзьмі свайго часу, паэзія станавілася маральным кодэксам жыцця народа. І вось таму кітайская паэзія рухаецца ў будучыню бесперапынна. Мы, беларусы, далучаліся да крохкай кітайскай цывілізацыі на працягу 7-8 стагоддзяў. Але крочым упэўнена. Хочам, каб маладая наша краіна расквітнела ў цэнтры Еўропы. І мы гэта зробім, таму што абапіраемся на сапраўдныя духоўныя каштоўнасці чалавецтва, у тым ліку і на кітайскія. Паверце, што часопіс «Полымя» не толькі кітайскую паэзію адкрыў. Ён вельмі шырока мысліць. У рубрыцы «Галасы свету» мы адкрылі і чылійскую паэзію, і паэзію Паўднёвай Карэі, Індыі, Таджыкістана нашага, Азербайджана. Гэта наша дружба, нашы галасы.

Дырэктар Антопальскага раённага Цэнтра рамёстваў Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці **Галіна СЦЕПАНЮК** атрымала прэмію за адраджэнне традыцыі ткацтва драгічынскіх паясоў. У жыцці нашых продкаў паясы заўжды займалі вельмі важнае месца. Галіна Міхайлаўна, якая пры мясцовым Цэнтры рамёстваў яшчэ і вядзе шмат гурткоў для дзетак, распавяла, чаму беларускія тканыя паясы з'яўляюцца сапраўднай каштоўнасцю і могуць прэтэндаваць на званне нацыянальнага брэнда:

— Нашы драгічынскія паясы мы пачалі адраджаць толькі 4 гады таму. Першы пояс, з якім мы сустрэліся, — гэта дзіцячы пояс «павівач» у дробненькія палосачкі пяшчотных колераў. Гэты пояс для таго, каб у нованароджанага дзіцяці ручкі і ножкі былі роўненькія. Пояс лічыўся абярэгам. Такія паясы мелі вялікае значэнне для нашых продкаў. Па поясе можна было даведацца, якога сацыяльнага статусу быў чалавек. Калі селянін, то пояс быў з чыстага лёну. Калі большага дастатку, то ў складзе пояса была воўна. А калі чалавек быў вельмі багаты, то ўпляталіся шаўковыя ніткі. Раней нельга было без пояса з'яўляцца на людзях. Калі я пачала займацца паясамі, іх адраджэннем, мы з дзеткамі сталі цікавіцца ў мясцовых жы-

Па поясе можна было даведацца, якога сацыяльнага статусу быў чалавек. Калі селянін, то пояс быў з чыстага лёну. Калі большага дастатку, то ў складзе пояса была воўна. А калі чалавек быў вельмі багаты, то ўпляталіся шаўковыя ніткі.

хароў пра паясы, хадзіць у экспедыцыі. Часта да нас самі людзі прыходзілі і паказвалі невялічкія кавалачкі паясоў, якія захаваліся, і па гэтых кавалачках мы ўзнаўлялі паясы. Паясы былі розныя на ўсе выпадкі жыцця: вясельныя, жалобныя... У нас на Драгічыншчыне быў адметны пояс для свахі, калі яна ішла да маладых. Гэта быў шырокі яркі пояс у палосачкі з вялікімі кутасамі. Яшчэ быў своеасаблівы пояс для бабыля — нежанатага мужчыны пасля 35 гадоў. Калі ён прыходзіў у госці на вяселле, то жанчыны, якія былі не замужам, бачылі, што гэта быў чалавек з дастаткам, але яшчэ свабодны. Пояс быў колеру цёмнай вішні з бэжавым, а па краях — арнамент. Гэта такі быў сігнал, каб бабыля можна было адразу заўважыць. Я заўсёды кажу «вялікі дзякуй» нашым людзям за тое, што яны з трапятаннем ставяцца да народнай культуры. Калі яны, напрыклад, бачаць ткачыху на нейкім фэсце, то доўга назіраюць за працэсам, а потым ідуць на кантакт і расказваюць нейкія цікавінкі пра паясы ў сваіх мясцовасцях. Толькі дзякуючы людзям мы можам захаваць нашу спадчыну.

Зоя СВЕТЛАЯ.

■ Спорт-тайм

«Залаты» ўзлёт Кушніра

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра выступленне нашых біятланістаў у Рупольдынгу, нечаканы трыумф Антона Кушніра ў ЗША і крыўднае паражэнне «Цмокаў».

1. Беларускія фрыстайлісты працягваюць здзіўляць выдатнай формай. **На этапе Кубка свету ў амерыканскім Дзір-Вэлі перамогу сваткаваў Антон Кушнір,** які апярэдзіў леташняга чэмпіёна свету кітайца Цы Гуанпу больш чым на 10 балаў. Гэта ўжо другая перамога беларуса ў гэтым сезоне. Крыху раней Кушнір стаў сярэбраным прызёрам на этапе Кубка свету ў Кітаі. Пасля перамогі ў ЗША беларускі фрыстайліст узначаліў агульны залік Кубка свету ў лыжнай акрабатыцы. Яшчэ адзін беларус, Аляксей Грышын, у гэтай класіфікацыі займае сёмае месца.

2. Перадапошні да Алімпіяды **этап Кубка свету па біятлоне ў Рупольдынгу** прынёс беларусам адзін медаль. У індывідуальнай гонцы на другую ступень п'едэстала ўзнялася Дар'я Домрачава. Магла наша прыма пазмагацца за месца ў першай тройцы і па выніках пасьюта, аднак пяць промахаў на стрэльбішчы перакрэслілі «медальныя» шанцы. Да фінішу Домрачава прыйшла толькі дванаццатай.

Двойчы ў дзясятцы адзначылася Надзея Скардзіна: у індывідуальнай гонцы другі нумар жаночай зборнай была сёмай, а ў пасьюце фінішавала дзявятай. Без перабольшванняў, гэта выдатнае выступленне Надзеі, якая прапускала папярэдні этап Кубка свету ў Аберхофе. Дарэчы, Скардзіна стала адзінай біятланісткай, якая ўсе тры гонкі ў Рупольдынгу правяла «на нуль»!

Шчыльныя вынікі нашых дзяўчат у апошніх гонках дазвалялі разлічваць на пэўны поспех і ў эстафеце. Аднак у камандную гонку не заявілася Дар'я Домрачава. Тым не менш палову гонкі беларускія біятланісткі ўтрымлівалі лідарства! І толькі чатыры промахі Анастасіі Дубарэзавай не дазволілі нашым дзяўчатам узняцца на п'едэстал. У выніку беларускі фінішавалі на шостай пазіцыі.

У чацвер стартуе апошні перад Алімпіядай этап Кубка свету ў Антхольцы. Біятланісты выйдуць на старт спрынту, пасьюта і эстафетнай гонкі.

3. Ужо сёння беларускія гандбалісты стартуюць на чэмпіянаце Еўропы ў Даніі. А вось іх малодшыя калегі паспяхова завяршылі выступленне на адборачным турніры чэмпіянату Еўропы. Атрымаўшы дзве ўпэўненыя перамогі над латышамі і італьянцамі, **гандбалісты юнацкай (да 18 гадоў) зборнай Беларусі выйшлі ў фінальную стадыю першынства Еўропы,** якое адбудзецца ў Польшчы з 14 па 24 жніўня.

4. У драматычным матчы **«Цмокі» саступілі літоўскаму «Няптунасу».** Літаральна за некалькі секунд да заканчэння сустрэчы лік на табло быў роўным — 72:72. Аднак удалая трохачковая атака Марыуса Рункаўскаса паставіла кропку ў гэтым матчы. Галоўны трэнер мінчан Дональдас Кайрыс выказаў здагадку, што вялікая колькасць памылак яго падапечных была абумоўлена месячным прастоем, які «закалыхаў каманду». Зараз у турнірнай табліцы Адзінай Лігі ВТБ «Цмокі» займаюць сёмую пазіцыю.

Пасля перамогі ў ЗША Антон Кушнір узначаліў залік Кубка свету па фрыстайле.

5. У матчы «зорак» КХЛ-2014, у якім упершыню за працяглы тэрмін не ўдзельнічалі хакеісты мінскага «Дынама», перамогу атрымала каманда Захаду. Дарэчы, за пераможцаў выступаў нядаўні гулец «зуброў» Джэф Плат, які адзначыўся дзвюма шайбамі. Пасля матча стала вядома, што ў наступным годзе «зорны» матч можа прайсці ў Мінску. За права правядзення хакейнага паядынку беларуская сталіца будзе змагацца з Омскам, Уфой і Заграбам.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

■ Запрашальнік

РОДНАЕ СЛОВА Ў «ГОРАДЗЕ МАЙГО СЭРЦА»

Паважаныя падпісчыкі «Звязды», аматары роднага слова! Запрашаем вас на творчую сустрэчу пад назвай «Горад майго сэрца» з паэтам, празаікам, кампазітарам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон», супрацоўнікам газеты «Звязда», ураджэнцам горада Заслаўе Дзмітрыем Пятровічам і яго сябрамі — вядомымі беларускімі творцамі. Арганізатары мерапрыемства — Саюз пісьменнікаў Беларусі, Заслаўскі гарвыканкам выдавецтва, «Чатыры чвэрці». Імпрэза пройдзе 17 студзеня ў 15.00 у Заслаўскай школе мастацтваў (вул. Савецкая, 26).

«НОВЫ ГОД ВАМ ПАЧЫНАЮ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Атрымліваецца, славутая песня «Песняроў» пра «Калядачкі, бліны-ладачкі» — менавіта пра яго, пра Шчодры вечар. Увогуле, ноч з 13 на 14 студзеня (а да 1918 года — самая што ні ёсць навагодняя — з 31 снежня на 1 студзеня) лічылася ў народнай культуры містычнай і непрадказальнай.

— Ноч паміж старым і новым годам была нібыта «кропкай разрыву» паміж светам «гэтым» і «тым», момантам існавання па-за часам (калі

ПЫТАННЕ ПА ТЭМЕ

Ці праўда, што навагоднюю ёлку трэба прыбіраць ужо 13 студзеня і чаму?

— Сапраўды, ёлкі 14 студзеня ў хаце ўжо не павінна быць, — гаворыць Янка Крук. — У спрадвечнай народнай культуры дрэва елка сімвалізуе пераход з аднаго стану ў другі (успомнім ролю менавіта яловых лапак у пахавальным абрадзе). Навагодняя ёлка — гэта таксама сімвал пераходу: «памірае» стары год — нараджаецца новы. І непасрэдна ў новым годзе (а ён фактычна і наступае ў ноч з 13 на 14 студзеня) ёй ужо не месца.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Увогуле, Каляды праводзілі ў розных рэгіёнах па-рознаму. На Віцебшчыне «жанілі Цярэшку», у Бярэзінскім раёне «цягнулі Каляду на дуба», у Давыд-Гарадку на Шчадрэц па вуліцах ездзілі «конікі», а ў Семежава, што на Капыльшчыне, хадзілі «Цары». Усе гэтыя абрады дзякуючы мясцовым жыхарам захаваліся да нашых дзён і зараз адраджаюцца, магчыма, у больш тэатральна-пастановачным выглядзе, але галоўнае — працягваюць жыць.

А 14 студзеня ўранку па вёсцы беглі маленькія калядоўшчыкі (дарослыя ўжо сваё адкалядавалі). Яны, нібы валачобнікі на Вялікдзень, заходзілі ў кожную хату з торбачкамі, але не з пустымі. У торбачках было зерне жыта, аўсу, ячменю. Малыя па кругу абыходзілі хату, пачынаючы ад парога, да кута і назад да печы, рассыпаючы па падлозе зерне і прыпяваючы: «Сею-сею, пасяваю, новы год вам пачынаю!». Гэта быў яшчэ адзін абрад, які праграмаваў кожны дом на шчасце і дабрабыт. Таму гаспадары не скупіліся на пачастункі для маладых «сейбітаў», адорвалі малых усялякімі прысмакамі: хто печывам, хто кавалкам каўбасы, сушанымі ягадамі, арэхамі. Радасць была бязмежная, шчырая, ад душы.

Вядома, сёння наўрад ці хто пойдзе калядаваць з торбачкай з зернем цераз плячо. Але пажадаць яшчэ раз родным, сябрам, калегам, проста ўсім добрым людзям шчасця, здароўя і дабрабыту ў новым годзе — чым не нагода?

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

■ Новыя павевы

О СПОРТ! ТЫ — МАСТАЦТВА!

Школьнік з Оршы Мікіта Мядзведзеў заняў першае месца ў Міжнародным конкурсе мультымедыйных рэсурсаў «Спорт у выяўленчым мастацтве», які быў абвешчаны старэйшым у Расіі дзяржаўным музеем рускага выяўленчага мастацтва — Дзяржаўным Рускім музеем — напярэдадні XXII Алімпійскіх гульняў і XI Паралімпійскіх зімовых гульняў 2014 года ў Сочы.

Мэта конкурсу заключалася ў актывізацыі дзейнасці наведвальнікаў і супрацоўнікаў 135 віртуальных філіялаў Рускага музея, якія працуюць у розных расійскіх і замежных гарадах, і стварэнні індывідуальных і калектыўных мультымедыйных рэсурсаў, прысвечаных тэме спорту ў выяўленчым мастацтве.

У якасці крыніц для стварэння конкурсных работ (відэафільмаў, электронных прэзентацый, віртуальных экскурсій) арганізатары прапанавалі выкарыстоўваць матэрыялы віртуальнай выставы «Спорт у выяўленчым мастацтве»: творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва, звязаных з тэмай конкурсу, якія складаюць частку фондаў Рускага музея, іншых расійскіх мастацкіх музеяў і прыватных калекцый.

Удзельнікам з Беларусі была дадзена магчымасць у конкурснай рабоце паказаць ролю нашай краіны ў міжнародным спартыўным руху, дасягненні асобных беларускіх спартсменаў, а таксама прыцягнуць увагу шырокай грамадскасці да чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску.

Адным з удзельнікаў конкурсу стаў вучань 4 класа СШ №19 г.Оршы Мікіта Мядзведзеў, які падрыхтаваў відэафільм «Спорт і турызм адной дарогай ідуць». Кіраўнік конкурснай работы — таленавіты фотамастак, кіна- і тэлеаператар Эдуард Эдуардавіч Навагонскі. У відэафільме былі выкарыстаны адлюстраванні калекцыі савецкіх значкоў, прысвечаных тэме спорту і фізічнай культуры, сабранай Эдуардам Навагонскім, відэасюжэты пра знакамітага аршанца — аднаго з мацнейшых у свеце канькабежцаў-спрынтараў 1980-1990-х гадоў, неаднаразовага рэкардсмена свету, сярэбранага і бронзавага прызёра зімовых Алімпійскіх гульняў, шматразовага чэмпіёна свету і СССР Ігара Жалязоўскага.

Па рашэнні журы Мікіту Мядзведзеву было прысуджана першае месца ва ўзроставай намінацыі «Малодшы школьны ўзрост (7-10 гадоў)». Крытэрыямі ацэнкі работ сталі арыгінальнасць, навізна сцэнарнага падыходу і тэхналагічных прыёмаў, афармленне і адпаведнасць мультымедыйнага рэсурсу тэме конкурсу. Дарэчы, усяго да ўдзелу ў ім былі запрошаны школьнікі, студэнты і педагогі з Расіі і з больш чым 20 замежных дзяржаў.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў адбудзецца 28 сакавіка гэтага года ў Дзяржаўным Рускім музеі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Нефармат

АНЁЛ-АХОЎНІК

«Ніколі не ведаеш, хто гэтую нітачку падвесіў, хто і як яе перарэжа», — прыкладна так разважаў адзін з герояў бессмяротнага рамана «Майстар і Маргарыта». Мелася на ўвазе, вядома, нітачка жыцця. Не ведаеш таксама, хто працягне нябачную руку, каб адхіліць тыя няўмольныя «нажніцы», якія гатовы ўжо зрабіць апошні шчаўчок на гэтай нітцы... Цяпер аб гэтым не раз думае Ніна Главацкая, гаспадыня аграсядзібы «Палескія традыцыі», гераіня адной з маіх ранейшых публікацый. З Нінай Мікітаўнай мы сустракаліся ў 2010 годзе. Я была літаральна зачаравана яе энергіяй і падзвіжніцтвам на ніве збірання і захавання фальклору, народных традыцый, абрадаў. Ніна Главацкая адна працуе нібы цэлы этнаграфічны аддзел. Яна ездзіць па вёсках свайго Кобрынскага і суседніх раёнаў, збірае песні, легенды, паданні. Купляе ў бабулек іх фартушкі, вышытыя кашулі, ручнікі, рэстаўруруе іх і ўпрыгожвае сваю сядзібу. У яе сядзібе абсталяваны не проста нумары для турыстаў з усімі выгодамі, а спальні ў стылі фольк: вышытыя падушкі, пакрывалы, абрусы, на падлозе тканыя ходнікі, — усё як у даўнейшай беларускай хаце. Гасцям у гэтай сядзібе прапануюць не толькі адпачынак з пансіёнам — тут пакажуць вясельны абрад, сезонныя абрады палескага краю.

Задумак і планаў у Ніны Мікітаўны заўсёды было вялікае мноства, і не ўзнікала сумненняў, што ўсё запланаванае ажыццявіцца. Маці ў яе імкненняў заўсёды падтрымлівалі ўсе трое яе дзяцей. Праўда, старэйшая дачка апошнім часам жыве ў Германіі. Да яе і вырашыла паехаць Ніна Мікітаўна са сваёй маці Марыяй Архіпаўнай напярэдадні Каляд. Тым больш, што ў Алесі нарадзілася другая дачушка ў сям'і. Вядома, бабуля і прабабуля спяшаліся ўбачыць немаўлятка.

— Ехалі на два тыдні, а нейкае дзіўнае прадчуванне было, — сказала мне ўчора ў тэлефоннай размове Ніна Главацкая. — Напярэдадні я наведала ўсіх старых знаёмых, прывяла ў парадак усю дакументацыю і пакінула распараджэнні, што рабіць у першую чаргу. Чаму? Не ведаю, але менавіта вось так...

Адным словам, жанчыны прыехалі ў Берлін раніцай. Зяць па тэлефоне паведаміў, што прыехаць па іх непасрэдна да цягніка не можа, папрасіў трохі пачакаць. Беларускі ўладкаваліся на ўтульных месцах, побач паставілі вялікія сумкі з падарункамі, якія яны везлі для маладой сям'і. Сядзелі, разглядалі іншых пасажыраў, аб нечым гутарылі. І раптам — удар і непрытомнасць... Калі Ніна Мікітаўна апрытомнела, яна адчула страшэнны боль, убачыла лужыну ўласнай крыві, мёртвага чалавека побач, пачула стогны сваёй маці і падумала, што аказалася ў эпіцэнтры нейкага тэракту.

Але ўсё было крыху не так. Як расказалі ёй пазней, нейкі чалавек вырашыў звесці рахункі з жыццём і... скочыў з-пад купала вакзала ўніз. Ён упаў якраз на іх сумкі — гэта і ўратавала яму жыццё. Яна прыняла яго за нежывога, бо ён не падаваў ніякіх прыкмет жыцця. Абедзвюх жанчын ён знёс з сядзенняў не столькі сваім целам, колькі магутнай хваляй паветра. У выніку Ніна Главацкая моцна стукнулася галавой аб бетонную падлогу — пазней у адной з берлінскіх клінік ёй наклалі дваццаць швоў. Старэйшая з жанчын пацярпела менш, ёй таксама аказалі кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Два тыдні яны правялі ў сям'і дзяцей, потым вярнуліся дадому, у вёску Андронава Кобрынскага раёна. Ніна Мікітаўна працягвае лячэнне і рэабілітацыю, бо ёй па-ранейшаму цяжка паварочваць галаву.

Доўга яшчэ будуць адчуваць наступствы шоку, які перажылі жанчыны. «Калі б ён упаў не на сумкі, а на нас, — разважае жыхарка Кобрынскага раёна, — мокрае месца ад усіх засталося б. Сумкі нашы літаральна ўзарваліся, усё змесціва як ад выстралу разляцелася па вакзале. Можа, нават не сантыметры, а міліметры траекторыі яго палёту вызначылі наш лёс. Цяпер мы з мамай молімся Богу і дзякуем свайму анёлу-ахоўніку».

Яшчэ Ніна Главацкая спадзяецца, што кіраўніцтва Берлінска-га вакзала пасля гэтага выпадку прыме дадатковыя меры бяспекі. Трэба ж нейкім чынам абмежаваць доступ людзей на вышыню трохпавярховага будынка, адкуль можна не толькі зляцець, але і скінуць што заўгодна на галовы пасажыраў. Невядома, як далей распарадзіцца сваім лёсам мужчына, якому таксама анёл-ахоўнік «падаслаў» сумкі невядомых яму беларускіх жанчын. Але Ніна жадае, каб ён усё ж такі навучыўся цаніць жыццё.

Гаспадыня сядзібы «Палескія традыцыі» запланавала цэлы шэраг мерапрыемстваў на гэты год. Сярод іх — рэканструкцыя не менш чым дзясятка нацыянальных касцюмаў як для самадзейнасці, так і для фотасесій гасцей. У жніўні тут збіраюцца правесці этна-дыскатэку для старшакласнікаў, каб абудзіць іх інтарэс да народнай культуры, да сваёй спадчыны. Яшчэ ў мой першы прыезд Ніна Мікітаўна гаварыла, як захапляецца сваімі продкамі, пакаленнямі бацькоў і дзядоў, якія жылі бедна, але ўмелі радавацца кожнаму дню, умелі захоўваць аптымізм («Кавалачак палескай беларускасці», «Звязда» ад 30 сакавіка 2010 г. — **Аўт.**). А цяпер гэтую думку яна пастараецца данесці да кожнага свайго госця.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ На слыху

ЭКЗАМЕН ДЛЯ НАСТАЎНІКА

Працэдура атэстацыі педагогаў стане больш дасканалай і зразумелай

Новы парадак правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў, які пачаў дзейнічаць крыху больш чым год таму, выклікаў шквал пытанняў у педагагічнай грамадскасці. Гэтыя пытанні ўзніклі ў самых розных аўдыторыях, у тым ліку на V пленуме галіновага прафсаюза і парламенцкіх слуханнях, прысвечаных удасканаленню заканадаўчай базы нацыянальнай сістэмы адукацыі. На пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі педагогам адводзіўся тэрмін да 1 верасня 2014 года. Але ў снежні стала вядома, што Міністэрства адукацыі вырашыла падоўжыць гэтыя тэрміны да 1 верасня 2017 года і ўнесці карэкціроўкі ў дзейную Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў. Пра тое, якія змены чакаюцца ў рэгуляванні пытанняў атэстацыі, мы папрасілі расказаць намесніка старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Рамана ДАПІРУ:

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Напрыканцы года ў Міністэрстве адукацыі пад старшынствам яго кіраўніка прайшла нарада па пытаннях удасканалення дзейнага парадку атэстацыі педагагічных работнікаў. Да ўдзелу ў дыскусіі былі запрошаны кіраўнікі сістэмы адукацыі самых розных узроўняў, работнікі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, прадстаўнікі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі і парламентарыі. Увазе прысутных быў прапанаваны праект змяненняў і дапаўненняў у дзейную інструкцыю. Праект змяшчае шэраг пазіцый, якія вырашаюць многія пастаўленыя галіновым прафсаюзам пытанні.

Пасля нарады ўпраўленнем кадравай палітыкі Мінадукацыі быў дапрацаваны рабочы варыянт праекта змяненняў і дапаўненняў у вышэйзгаданую інструкцыю, які мы атрымалі для ўнясення ў яго сваіх заўваг і прапаноў. У Цэнтральным камітэце прайшло пасяджэнне рабочай групы ў складзе спецыялістаў ЦК, Мінскага абкама і Мінскага гаркама галіновага прафсаюза. Сваё бачанне, як можна ўдасканаліць парадак атэстацыі педагагічных работнікаў, мы ўжо накіравалі ў галоўнае адукацыйнае ведамства.

«Не тая» адукацыя

— І што ж прапануе галіновы прафсаюз?

— Па-першае, варта адразу вызначыцца з тым, што інструкцыя не рэгулюе пытанні кваліфікацыйных патрабаванняў, якія ўстаноўлены апошнім выпускам Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых «Пасады служачых, занятых у адукацыі». Па-другое, інструкцыя не вызначае працэдуру правядзення кваліфікацыйнага экзамену, якая ўрэгулявана іншым дакументам. Гэтыя пытанні будуць прапрацоўвацца ў асобным парадку, хоць дамоўленасць наконт удасканалення працэдуры кваліфікацыйнага экзамену ўжо дасягнута.

Галіновы прафсаюз прапануе наступнае. У дзейнай рэдакцыі інструкцыі не пазначаны тэрмін правядзення працэдуры атэстацыі, у сувязі з чым на месцах узнікаюць пытанні наконт своечасовасці прыняцця атэстацыйнымі камісіямі адпаведных рашэнняў. Таму прапануецца вызначыць, што працэдура атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) другой, першай кваліфікацыйнай катэгорыі не павінна перавышаць трох месяцаў з дня падачы педагагічным работнікам заявы ў атэстацыйную камісію. Адпаведна, працэдура атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» не павінна перавышаць трох месяцаў з дня прадастаўлення дакумента аб здачы кваліфікацыйнага экзамену. У Цэнтральны камітэт паступалі звароты наконт дзеянняў атэстацыйнай камісіі ў выпадках часовай непрацаздольнасці педагагічнага работніка, які праходзіць атэстацыю. У сувязі з гэтым прапануецца па жаданні педагагічнага работніка ў вышэйзгаданыя тэрміны правядзення атэстацыі не залічваць тэрмін яго часовай непрацаздольнасці.

Асабліва шмат праблем выклікаюць сітуацыі, звязаныя з немагчымасцю атэстацыі педагагічных работнікаў, калі яны маюць адукацыю, якая не адпавядае кваліфікацыйным патрабаванням.

Асабліва шмат праблем на месцах выклікаюць сітуацыі, звязаныя з немагчымасцю атэстацыі педагагічных работнікаў у выпадках, калі яны маюць «не тую» адукацыю (яна не адпавядае кваліфікацыйным патрабаванням). Найбольш часта скаргі паступалі ад выхавальнікаў установ дашкольнай адукацыі, якія маюць педагагічную адукацыю, але не прайшлі перападрыхтоўку па накірунку «Педагогіка дзяцінства», а таксама ад настаўнікаў фізікі, матэматыкі, хіміі, якія маюць вышэйшую, але не педагагічную адукацыю. Улічваючы тое, што сёння ўстановы адукацыі адчуваюць сур'ёзны недахоп спецыялістаў адпаведных профіляў, мы прапануем дапускаць атэстацыю педагагічных работнікаў на прысваенне другой і першай кваліфікацыйных катэгорый па пасадах: «выхавальнік дашкольнай адукацыі» — пры наяўнасці вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі па профілях адукацыі «Педагогіка» і «Педагогіка. Прафесіянальная адукацыя» і «настаўнік» — пры наяўнасці вышэйшай адукацыі па профілі адукацыі «Прыродазнаўчыя навукі».

З вышэйшай — у сярэднюю школу

— У сувязі са змяншэннем кантынгенту студэнтаў некаторыя выкладчыкі ВНУ ўжо задумаліся над тым, каб пайсці працаваць у школу. Скажыце, ці змогуць яны разлічваць на атрыманне кваліфікацыйнай катэгорыі? Або ім давядзецца распачынаць сваю «кар'еру» ў школе з нуля, паколькі патрэбны для атрымання катэгорыі стаж работы на педагагічнай пасадзе ў іх адсутнічае?

— Сёння ў выпадку прыёму на пасады педагагічных работнікаў прэферэнцыі пры правядзенні атэстацыі прадугледжаны толькі для тых прадстаўнікоў вышэйшай школы, якія маюць вучоную ступень і (ці) вучонае званне.

Неабходна разумець, што прафесарска-выкладчыцкі склад ва ўстановах вышэйшай адукацыі не праходзіць атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі, бо гэтыя пасады не катэгарыруюцца. Зразумела, што дзейная сістэма правядзення конкурсу на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу мае, па сутнасці, характар атэстацыі і праводзіцца не менш чым раз у пяць гадоў. Значыць, у выпадку прыёму на пасады, якія катэгарыруюцца, асоб, што займалі пасады прафесарска-выкладчыцкага складу, неабходна пры вырашэнні пытанняў атэстацыі ўлічваць стаж іх працы на адпаведных пасадах. Гэта ж тычыцца і навуковых работнікаў.

Галіновы прафсаюз прапануе дапускаць асоб, якія прымаюцца на пасады педагагічных работнікаў з пасад прафесарска-выкладчыцкага складу, і навуковых работнікаў да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі пры наяўнасці стажу работы на вышэйпазначаных пасадах у ВНУ не менш чым два гады. І першай кваліфікацыйнай катэгорыі — пры наяўнасці стажу на вышэйпазначаных пасадах не менш чым пяць гадоў.

«Пераход» ці «перавод»?

— А што будзе з адным з самых праблемных у новай інструкцыі дваццатым пунктам, паводле якога педагог, які працаўладкоўваецца ў іншую ўстанову адукацыі не шляхам пераводу, пазбаўляецца сваёй кваліфікацыйнай катэгорыі?

— Да ўступлення ў сілу дзейнай інструкцыі атрыманая педагагічным работнікам на іншай пасадзе кваліфікацыйная катэгорыя магла быць улічана пры пераходзе на новую пасаду без прад'яўлення патрабаванняў да наяўнасці стажу працы па новай пасадзе. Праўда, трэба прызнаць, што пералік адпаведных пасад быў даволі абмежаваны. Пры ўступленні ў сілу новай інструкцыі сітуацыя змянілася. Тэрмін «пераход» быў заменены на «перавод», а перавод рэгулюецца ўжо артыкулам 30 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Сёння спецыялісты Мінадукацыі і галіновага прафсаюза салідарныя ў тым, што пры прадастаўленні адпаведнай прэферэнцыі пад увагу трэба браць не характар змен у працоўных адносінах, а сам факт наяўнасці прысвоенай раней кваліфікацыйнай катэгорыі па пасадзе педагагічнага работніка. Таму мы прапануем выключыць частку першую пункта 20 інструкцыі ў іншай рэдакцыі: «... педагагічным работнікам пры праходжанні атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі на адпаведнай пасадзе педагагічнага работніка без прад'яўлення патрабаванняў да наяўнасці стажу працы на гэтай пасадзе можа быць прысвоена тая ж кваліфікацыйная катэгорыя, якая ім была прысвоена раней па іншай пасадзе педагагічнага работніка». І пашырыць пералік пасад педагагічных работнікаў, якія змогуць карыстацца гэтай прэферэнцыяй. У прыватнасці, прапануецца прадаставіць такое права настаўнікам, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі па пасадах выкладчыка ці метадыста; настаўнікам-дэфектолагам, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі па пасадзе метадыста; педагогам-арганізатарам, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі па пасадах метадыста, выхавальніка, педагога-псіхолага, педагога сацыяльнага, педагога дадатковай адукацыі; сацыяльным педагогам, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі па пасадах метадыста, выхавальніка, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, культарганізатара, педагога дадатковай адукацыі; педагогам-псіхолагам, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі па пасадах метадыста, выхавальніка, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, культарганізатара, педагога дадатковай адукацыі, а таксама некаторым іншым катэгорыям.

Вырашэнне гэтага пытання дапаможа абараніць інтарэсы педагагічных работнікаў у выпадках аптымізацыі і рэарганізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, бо па факце сёння многія педагогі вымушаны працаваць не па сваім профілі, а там, дзе для іх знайшлася работа.

Дырэктар таксама педагог!

— А ці змогуць прэтэндаваць на прысваенне ім больш высокай кваліфікацыйнай катэгорыі кіраўнікі ўстаноў адукацыі, якія атрымалі сваю катэгорыю, калі працавалі радавымі педагогамі?

— Улічваючы тое, што вялікая колькасць кіраўнікоў установ адукацыі паралельна з асноўнай кіраўніцкай работай працягвае ажыццяўляць педагагічную дзейнасць (у самых розных формах, у тым ліку па грамадзянска-прававых дагаворах, замяняюць часова адсутнага работніка як у сваёй, так і ў іншых установах адукацыі), а таксама тое, што кіраўнікі ўстаноў адукацыі не атэстуюцца на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі па сваіх асноўных пасадах, галіновы прафсаюз лічыць неабходным даць ім права праходзіць атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі незалежна ад характару афармлення працоўных і грамадзянска-прававых адносін з адпаведнымі ўстановамі адукацыі пры ўмове ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці. Таму прапануецца выключыць пункт 21 інструкцыі ў наступнай рэдакцыі:

«Кіраўнікі арганізацый сістэмы адукацыі (іх намеснікі), якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць у частцы рэалізацыі зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання, маюць права праходзіць атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі па адпаведных пасадах педагагічных работнікаў ва ўстаноўленым дадзенай інструкцыяй парадку».

Адпаведна, пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі кіраўнікамі ўстаноў адукацыі ажыццяўляецца ў тым выпадку, калі яны займаюць пасаду педагагічнага работніка, па якой ім прысвоена кваліфікацыйная катэгорыя.

— Многіх педагагічных работнікаў цікавіць, чаму згодна з 30-м пунктам інструкцыі яны вызваляюцца ад здачы кваліфікацыйнага экзамену на прысваенне вышэйшай катэгорыі, але ад абавязку пацвярджаць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю іх чамусьці не вызвалілі...

— Як я разумею, вы маеце на ўвазе заслужаных настаўнікаў, аўтараў падручнікаў, пераможцаў рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства і г.д. Міністэрства адукацыі прапанавала вызваліць іх ад здачы кваліфікацыйнага экзамену і пры праходжанні атэстацыі на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Прафсаюз, у сваю чаргу, прапануе вызваліць педагогаў таксама ад абавязку пацвярджаць кожныя пяць гадоў кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст». Гэта лагічна, бо ствараць аўтарскую методыку кожныя пяць гадоў нерэальна. У любым выпадку такі крок мог бы павысіць статус настаўнікаў з кваліфікацыйнай катэгорыяй «настаўнік-метадыст».

Акрамя таго, прапануецца ўключыць у пералік вышэйзгаданых педагагічных работнікаў у дадатак да пераможцаў рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства таксама пераможцаў іншых рэспубліканскіх конкурсаў. Для гэтага трэба падрыхтаваць дадатак, у якім будуць прадугледжаныя назвы ўсіх адпаведных конкурсаў, у тым ліку тых, якія не маюць ці да пэўнага часу не мелі статус рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў. Напрыклад, конкурсы педагагічных работнікаў установ спецыяльнай адукацыі і іншыя.

Мяркую, што ўсе згаданыя змяненні і дапаўненні дазволяць зрабіць працэдуру атэстацыі педагагічных работнікаў больш дасканалай і зразумелай. Варта таксама дадаць, што Міністэрства адукацыі палічыла мэтазгодным падоўжыць перыяд правядзення атэстацыі на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі да 1 верасня 2017 года.

Улічваючы тую акалічнасць, што кваліфікацыйны экзамен пры праходжанні атэстацыі плануецца праводзіць, як правіла, у межах засваення праграмы павышэння кваліфікацыі, пры планаванні атэстацыі абавязкова трэба будзе ўлічваць графік павышэння кваліфікацыі педагогаў.

Надзея НІКАЛАЕВА

Прафсаюз прапануе вызваліць педагогаў ад абавязку пацвярджаць кожныя пяць гадоў кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст». Стварацца аўтарскую методыку кожныя пяць гадоў нерэальна.

■ Энергазберажэнне

ВУЧЫМСЯ ЭКАНОМІЦЬ

Лепшыя работы па эканоміі і энергазберажэнні прадставілі навучэнцы і педагогі Міншчыны падчас абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Энергамарафон — 2013». Абарона праектаў прайшла ў мар'інагорскай гімназіі. І гэта невыпадкова.

Вячаслаў КАРАВА дэманструе макет «Мінск Сіці-2050.

— Менавіта тут створаны першы і пакуль адзіны ў вобласці музей «Эвалюцыя энергазберажэння», — расказала метадыст аддзела арганізацыйна-метадычнага забеспячэння турысцка-краязнаўчай і эколага-біялагічнай работы Мінскага абласнога вучэбна-метадычнага цэнтра Наталля Абухова. — Метадычную дапамогу ў стварэнні музея аказаў наш цэнтр. У падборы экспанатаў прымалі ўдзел установы адукацыі Міншчыны. Сёння ў фондах звыш 150 экспанатаў. Сімвалам музея стала міфалагічная птушка фенікс, якая мае здольнасць спальваць сябе, а затым адраджацца з попелу. Фенікс — трыумф вечнага жыцця.

Калекцыя прадметаў расказвае пра развіццё энергетыкі са старажытных часоў: ад першых паселішчаў на тэрыторыі Беларусі і да нашых дзён, пра з'яўленне першых паравой машыны і электрастанцыі. Экспазіцыя мае не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Менавіта тут школьнікаў вучаць беражлівым адносінам да крыніц энергіі, эканоміі, развіваюць імкненне і цікавасць да навукі. Варта дадаць, што музей папаўняецца новымі экспанатамі, макетамі, зробленымі навучэнцамі ўстаноў адукацыі пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў. Напрыклад, па праекце навучэнкі Жодзінскай жаночай гімназіі Веры Васілеўскай прадпрымальнік правёў рэканструкцыю станцыі тэхнічнага абслугоўвання, што дало магчымасць атрымаць эканамічную выгаду.

На простых, а часам і незвычайных прыкладах удзельнікі конкурсу дэманстравалі ўменне, як скараціць затраты на электраэнергію, ацяпленне. Дзмітрый Сурмач, Аляксандр Раманчык, Міхаіл Баўдзей з Маладзечанскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа пад кіраўніцтвам педагога дадатковай адукацыі Валянціна Доўбышава змайстравалі генератар, які пераўтварае энергію ветру ў электрычную энергію. Прыбор можна выкарыстоўваць як у быце, так і на вытворчасці. Яўген Дайноўскі з гэтага ж каледжа зладзіў вельмі цікавы і просты ў прымяненні прыбор з складанай назвай — «дэцэнтралізаваны рэкуператар цяпла вентыляцыйнага паветра», а прасцей — энергазберагальны цеплаабменнік. Ён прызначаны для паветрааабмену ў памяшканнях шляхам прытоку чыстага паветра і выдалення забруджанага. Кіраўнік праекта — выкладчык Андрэй Багдановіч.

па праекце навучэнкі Жодзінскай жаночай гімназіі Веры Васілеўскай прадпрымальнік правёў рэканструкцыю станцыі тэхнічнага абслугоўвання, што дало магчымасць атрымаць эканамічную выгаду.

Гэтае прыстасаванне незаменнае ў памяшканнях, дзе ўстаноўлены еўравокны з шклопакетамі, што вядзе да парушэння санітарных нормаў, зніжэння колькасці кіслароду і павелічэння вуглякіслага газу ды іншых шкодных бактэрый, з'яўлення цвілі.

Вучні Уздзенскай сярэдняй школы № 2 імя К.К. Крапівы Глеб Гоцман і Андрэй Малькевіч (кіраўнікі Алена Іаргачова і Сяргей Чаберкус) распрацавалі макет школы ўстойлівага развіцця XXI стагоддзя з улікам мадэрнізацыі тыпавых будынкаў 1970—1980-х гадоў. Гэты праект дазволіць эфектыўна і рацыянальна выкарыстоўваць разнастайныя віды энергіі. Эканамічны эфект пасля рэканструкцыі склаў 51,3%.

Даволі цікавы праект паказаў на конкурсе Вячаслаў Карава з мар'інагорскай гімназіі. Гэта макет «Мінск Сіці-2050» — яркі ўзор комплекснага падыходу да пытанняў энергазберажэння з прымяненнем інавацыйных тэхналогій, кінетычнай энергіі і ўзнаўляльных крыніц цяпла.

На конкурсе было прадстаўлена некалькі намінацый. У намінацыі «Лепшы педагагічны работнік па арганізацыі работы па выхаванні культуры энергазберажэння ў навучэнцаў» перамог настаўнік фізікі і экалогіі Аляксандр Савянок з гімназіі № 6 Маладзечна. Першае месца сярод агітбрыгад занялі артысты з Барысаўскага дзяржаўнага каледжа (кіраўнік Наталля Шаўкунова). Пераможцы прадставяць Міншчыну на рэспубліканскім конкурсе «Энергамарафон».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Жыллё

КАБ НЕ БЫЛО ДАЎГАБУДАЎ І «КВАДРАТ» ТАННЕЎ

У Віцебску адбыўся семінар па пытаннях працы будаўнічага комплексу. Адказныя асобы розных узроўняў абмяркоўвалі тэмы, якія хвалююць многіх беларусаў: што зрабіць, каб больш не было даўгабудаў, і ці магчыма панізіць кошт квадратных метраў у дамах, якія ўзводзяцца пры дзяржаўнай падтрымцы?

— Завышаныя тэрміны будаўніцтва і рост цэн на пратэрмінаванае па часе ўводу жыллё выклікаюць справядлівую незадаволенасць жыхароў рэспублікі. Патрабаванне Прэзідэнта — давесці да лагічнага завяршэння праблемныя будоўлі жылля да 1 ліпеня гэтага года. Адпаведным указам прадугледжана будаўніцтва толькі па дзяржаўным заказе жылля для грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў і аднаразовых субсідый на будаўніцтва або набыццё жылых памяшканняў. І такі парадак павінен, у прынцыпе, выключыць з'яўленне даўгабудаў. Пры гэтым кошт квадратнага метра такога жылля павінен адпавядаць памеру сярэднямесячнай зарплаты ў краіне, скарэктаванай на ўстаноўлены каэфіцыент, — нагадаў прысутным **Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі.**

Паводле яго слоў, самая вострая праблема будаўнічай галіны — карупцыя. Ёсць нямала прыкладаў махлярства і крадзяжу, завышэння аб'ёмаў і кошту праектных і будаўнічых работ.

Ад будаўнікоў кіраўніцтва краіны патрабуе навесці парадак, заўсёды прытрымлівацца працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны. Неабходна забяспечыць дакладнае выкананне рэгламенту будаўнічага працэсу, павысіць культуру будаўніцтва.

— Павінны кануць у Лету выпадкі валакіты і бюракратызму ў пытанні зямельных адносін, а механізм размеркавання зямельных участкаў павінен працаваць як гадзіннік. Нямала нараканняў і ў дачыненні да праекціроўшчыкаў. Больш як 80% праектнай дакументацыі — з недапрацоўкамі і памылкамі, — працягнуў Аляксандр Якабсон.

— На жаль, ёсць і такое, калі будаўнічыя работы выконваюць грамадзяне без неабходнай дзяржаўнай рэгістрацыі: людзі аб'ядноўваюцца ў так званыя брыгады і атрымліваюць незаконны даход, а падаткі не плацяць. А тымі, хто працуюць легальна, завышаецца кошт матэрыялаў і будаўнічых работ. Летась па заведзеных нашым дэпартаментам крымінальных справах вярнулі страту дзяржаве ў памеры каля 30 мільярдаў рублёў,— расказаў **Ігар МАРШАЛАЎ, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў.**

Што тычыцца стану спраў у будаўнічым комплексе Віцебшчыны, назіраецца кадравы голад. А цякучка кадраў — 22%. Колькасць працуючых у будаўнічых арганізацыях толькі за студзень — лістапад мінулага года ў параўнанні з 2010 годам паменшылася ў 2 разы! Нягледзячы на тое, што фінансавыя вынікі працы будаўнічых арганізацый за 10 месяцаў 2013 года некалькі палепшыліся і зменшылася колькасць стратных арганізацый, «чыстая» страта склала больш як 100 мільярдаў рублёў.

У параўнанні з іншымі абласцямі, на Віцебшчыне — самыя нізкія аб'ёмы выкананых будаўнічых работ. І жылля будуецца значна менш, чым у іншых абласцях краіны. Адпаведнае заданне летась было выканана прыкладна напалову. У 2013 годзе ў Гродзенскай вобласці, дзе параўнальна менш насельніцтва, было пабудавана жылля ў 2 разы больш, чым на Віцебшчыне, а ў Брэсцкай — у 2,5 раза.

Віцэ-губернатар, які курыруе будаўнічую галіну, не ўтойвае праблем.

— Цякучка кадраў ёсць, але ў асноўным у недзяржаўных арганізацыях. Што тычыцца праблем з недахопам будаўніцтва жылля, безумоўна, ёсць значныя змяненні ў крэдытаванні грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Кошт квадратнага метра ў дамах, будаўніцтва якіх пачалося восенню мінулага года, — ад 8,5 мільёна да 11 мільёнаў рублёў. Напрыклад, у звычайнай двухпакаёвай кватэры плошчай 60 квадратных метраў кошт «квадрата» — 9 мільёнаў рублёў. Памер ільготнага крэдыту — 286 мільёнаў рублёў. Астатнія грошы забудоўшчык сам «шукае». І кожнаму патэнцыяльнаму навасёлу за абслугоўванне двух крэдытаў — льготнага і звычайнага — трэба штомесяц плаціць 14,2 мільёна рублёў, — адзначыў **Анатоль ДЗІУЛІН, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.**

У выніку пасля змянення ўмоў крэдытавання ва ўсёй вобласці колькасць ахвотных крэдытавацца зменшылася ў разы: з больш як 72 тысяч жыхароў Віцебшчыны, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, толькі 6 тысяч чалавек далі згоду прымаць удзел у будаўніцтве жылля па новых умовах.

У якасці прапановы — павінна аказвацца дзяржаўная падтрымка тым, хто мае на гэта законнае права, у памеры фактычнага кошту квадратнага метра.

Дарэчы, калі параўнаць кошт «квадрата» ў індывідуальным жыллі, якое будуецца з нуля, то, па падліках спецыялістаў, ён каштуе ў сярэднім 11,5 мільёна рублёў. Толькі ў чатырох раёнах вобласці ёсць чарга на будаўніцтва такога жылля. Больш як 5,6 тысячы ўчасткаў зямлі вылучаны пад будаўніцтва катэджаў — практычна ва ўсіх населеных пунктах вобласці...

У бліжэйшы час аналагічныя семінары адбудуцца ў іншых рэгіёнах краіны. Яны паспрыяюць павышэнню прафесійных патрабаванняў да ўсіх удзельнікаў будаўнічай галіны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Утерянное свидетельство о гос. регистрации ЗАО «СДГПРОМИМПЭКС», УНП 101231724, Устав ЗАО «СДГПРОМИМПЭКС» **считать недействительными.**

В связи с утратой бланка лицензии **считать** лицензию № 02010/8866 на право осуществления охранной деятельности **недействительной.** УНП 690601006

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Нестановичи-Агро» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже

здания ремонтной мастерской

(здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), общей площадью 1954.0 кв.м (инв. № 601/С-22624), расположенного на земельном участке площадью **0,5332 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Победы, 86, корп. 4**

Начальная цена с НДС – 2 942 400 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (294 240 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.01.2014 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.01.2014 до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

ДОПОЛНЕНИЕ от 14.12.2013 г. В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»).

СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО), опубликованной в газете «Звязда» 19.12.2013 г. № 239

Предлагается для заключения договоров долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, – 15 единиц (квартир), из которых:

1-комнатные (4 шт.) – Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (с чистовой отделкой) составляет – при 100% оплате 1500 долларов США, при оплате в рассрочку 1550 долларов США.

2-комнатные (3 шт.) – Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – при 100% оплате 1420 долларов США, при оплате в рассрочку 1450 долларов США.

2-комнатные (4 шт.) – Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (с чистовой отделкой) составляет – при 100% оплате 1470 долларов США, при оплате в рассрочку 1500 долларов США.

3-комнатные (4 шт.) – Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (с чистовой отделкой) составляет – при 100% оплате 1430 долларов США, при оплате в рассрочку 1450 долларов США.

13.01.2014 г.

Застройщик СЗАО «ЛадаГарант»_____ Ваганов А.В.

УНП 100934917

■ Пытальнік

САНІТАРНЫЯ ЗОНЫ ВАКОЛ КОМПЛЕКСАЎ НІХТО НЕ АДМЯНЯЎ

Прывітанне, дарагая рэдакцыя газеты «Звязда»! Будзем вельмі спадзявацца, што наша пісьмо ўсё ж такі патрапіць у газету. Нашаму абурэнню няма межаў. За што мы павінны так пакутаваць? Уся праблема заключаецца ў тым, што нам, вясковым жыхарам, не дазваляюць трымаць свіней. Спасылаюцца ўсё на афрыканскую чуму, якой у нас няма, не было і, дасць Бог, не будзе... Дык чаму павінны пакутаваць усе людзі там, дзе ёсць свінафермы? Чаму мы не павінны трымаць свіней з-за гэтых зон?.. Паважаная рэдакцыя! Калі ласка, дапамажыце нам у той сітуацыі, што склалася ў нас.

Жыхары вёскі Сурынка Слонімскага раёна

Ліст вяскоўцаў насамрэч куды большы па аб'ёме. Ды і эмоцыі ў ім месцамі вельмі «зашкальваюць»... У прынцыпе, рэдакцыя мела поўнае права не рэагаваць на гэты зварот, паколькі ён — ананімны. Тым не менш мы паспрабавалі разабрацца ў сітуацыі, выкладзенай у ім, і высветлілі, што адказ (і не адзін) вяскоўцы раней ужо атрымалі. Яны звярталіся ў шматлікія інстанцыі, у тым ліку да старшыні райвыканкама і ў пракуратуру. Пра гэта нам распавялі ў Слонімскай райветстанцыі.

Тут нам пацвердзілі словы заяўнікаў, што, сапраўды, ніякіх ачагоў афрыканскай чумы ў раёне, на шчасце, няма, сітуацыя цалкам спакойная. Аднак і рашэнне Мінсельгасхарча (з далейшымі адпаведнымі рашэннямі аблвыканкама і райвыканкама) аб стварэнні 5-кіламетровай санітарнай зоны вакол свінагадоўчых комплексаў ніхто не адмяняў. Дакумент прадпісвае адназначна: на гэтай тэрыторыі свіней на прыватных падворках быць не павінна.

— Ад вёскі Сурынка да бліжэйшага свінагадоўчага комплексу — менш за кіламетр, — паведамілі нам работнікі Слонімскай райветстанцыі. — Таму ў свой час і быў арганізаваны абход камісіяй усіх падворкаў, каб давесці да людзей інфармацыю, што свіней трымаць нельга. І потым заяўнікі неаднойчы атрымлівалі тлумачэнні. Свіней трэба было пакалоць. Прадукцыю забою вяскоўцы пакінулі сабе. Да нядаўняга часу ў Сурынках на ўсю вёску заставалася толькі 13 парасят. Яны былі настолькі малыя, што забіваць іх не было ніякага сэнсу. Па просьбе жыхароў іх пакінулі на невялікі час — вось якраз да зімовых свят — для дарошчвання

■

■ Самыя-самыя

БДУ — У ТРОЙЦЫ ЛІДАРАЎ НА ПОСТСАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ

У рэйтынгу ўніверсітэтаў краін СНД, Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі, які прадставіў у Маскве «Інтэрфакс» (INTERFAX. RU), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заняў другую прыступку.

Усяго была прааналізавана дзейнасць 405 ВНУ з 15 краін постсавецкай прасторы. На першай пазіцыі размясціўся (што, напэўна, не стала нечаканасцю) Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В.Ламаносава, а на трэцяй — Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт. У пяцёрку лепшых увайшлі таксама Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі і Вільнюскі ўніверсітэт.

Пры фарміраванні рэйтынгу ВНУ ўлічваліся крытэрыі, якія адлюстроўваюць тры сферы дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў: адукацыйную, навукова-даследчую і міжнародную. Методыка складання рэйтынгу распрацоўвалася з прымяненнем асноўных метадалагічных падыходаў агенцтва QS, якое фарміруе міжнародны рэйтынг універсітэтаў QS WUR на працягу апошніх дзесяці гадоў. Выкарыстоўваліся навукова-метрычныя даныя Навуковай электроннай бібліятэкі (www.elibrary.ru) і міжнароднай навукова-метрычнай сістэмы Scopus. Праводзіла таксама апытанне экспертаў-навукоўцаў і экспертаў-працадаўцаў.

Сярод 405 ВНУ, ахопленых даследаваннем, — 21 беларуская. У Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта — 24 пазіцыя ў рэйтынгу, а ў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — 32 месца. Такім чынам, тры беларускія ВНУ ўвайшлі ў ТОП-50 універсітэтаў краін постсавецкай прасторы.

Нагадаем, што на апошнім пасяджэнні Савета па адукацыі пры Інтэграцыйным камітэце ЕўрАзЭС у Мінску ў цэнтры ўвагі аказалася стварэнне незалежнага рэйтынгу ВНУ краін ЕўрАзЭС. На думку міністра адукацыі нашай краіны Сяргея Маскевіча, гэта павінен быць рэйтынг з крытэрыямі, выканальнымі для ўніверсітэтаў еўразійскай прасторы.

— Трэба сфармуляваць тыя мэты і задачы, якія могуць вырашаць нашы ВНУ. Напрыклад, калі вышэйшыя навучальныя ўстановы ЗША могуць дазволіць сабе запрашаць нобелеўскіх лаўрэатаў, то для ВНУ на прасторах ЕўрАзЭС гэты прынцып не можа быць асноўным крытэрыем пры пабудове рэйтынгу, — падкрэслівае Сяргей Маскевіч. — Ёсць пытанні і па такой градацыі, як профільнасць ВНУ, паколькі абітурыенту або наймальніку не будзе зразумела, як арыентавацца на рэйтынг, якія не ўлічвае спецыфіку паміж гуманітарнымі, класічнымі і тэхнічнымі ВНУ. Трэба знайсці механізм ацэнкі, які будзе карысны як для ВНУ-лідараў, якія ўдзельнічаюць у замежных рэйтынгах, так і для ВНУ, якія рыхтуюць асноўную колькасць спецыялістаў для вытворчасці.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Сітуацыя

УЗМАЦНЕННЕ ПАКАРАННЯ АПРАЎДАЛА СЯБЕ

Дзякуючы ўзмацненню мер адказнасці за кіраванне транспартам у стане алкагольнага ап'янення на Віцебшчыне ў разы паменшылася колькасць вадзіцеляў, якія асмельваюцца руліць нецвярозымі. Тым больш паўторна.

— Пасля ўступлення ў законную сілу новага Кодэкса рэзка скараціласа колькасць нецвярозых кіроўцаў. Цяпер кожны дзень у вобласці затрымліваюцца максімум 9 чалавек, раней, за суткі, ад 30 і больш, — расказаў карэспандэнту «Звязды» **Сяргей МАТАРОНАК, начальнік упраўлення ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама.**

Летась па віне нецвярозых вадзіцеляў здзейснена 70 дарожна-транспартных здарэнняў, па віне такіх кіроўцаў загінулі 20 чалавек, 80 — атрымалі траўмы.

Больш як 5 тысяч нецвярозых кіроўцаў за мінулы год былі затрыманы супрацоўнікамі ДАІ. Каля 440 паўторна на працягу года селі за руль у нецвярозым стане (з іх прыкладна кожны чацвёрты — у абласным цэнтры).

Найбольшая колькасць нецвярозых за рулём была затрымана ў Віцебску — прыкладна 1150, у полацкім рэгіёне (Полацк, Полацкі раён, Наваполацк) — 765, у Оршы і Аршанскім раёне — 635. Сярод іншых раёнаў сумныя лідары: Глыбоцкі раён — каля 240, Пастаўскі — больш як 200, Лепельскі — прыкладна 200 і Чашніцкі раён — больш як 175 затрыманых.

У абласной ДАІ нагадалі, што транспартны сродак будзе абавязкова канфіскаваны, калі ім паўторна кіраваў адзін і той жа чалавек у нецвярозым стане, незалежна ад таго, асабісты гэты транспарт або належыць арганізацыі, прадпрыемству. Зразумела, уладальнікі транспартных сродкаў маюць рацыю, калі будуць патрабаваць кампенсаваць кошт канфіскаваных у даход дзяржавы «колаў». Такім чынам, напрыклад, калі другі раз папаўся супрацоўнікам ДАІ нецвярозы трактарыст, гаспадарка, дзе ён працуе, мае магчымасць праз суд патрабаваць вярнуць грошы за канфіскаванага «жалезнага каня».

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Лёсы

ВАМ І НЕ СНІЛАСЯ...

Амаль на ўскрайку лесу ў сталічным мікрараёне Дражня прытуліўся невялікі двухпавярховы домік. Знешне ён нічым не адрозніваецца ад сотняў сабе падобных. І толькі шыльда на дзвярах выдае сапраўднае прызначэнне пабудовы: тут размяшчаецца дом начнога знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства. Вось ужо больш за дванаццаць гадоў гарадскія бадзягі не толькі шукаюць тут часовае прыстанішча, але і атрымліваюць шанц вярнуцца ў ранейшае жыццё.

Фота Надзеі БУЖАН.

У часы СССР бадзяжніцтва было супрацьзаконным. Чалавек, які вёў такі лад жыцця, мог быць асуджаны да двух гадоў. Але ў 1991-м гэтую практыку адмянілі. І толькі напрыканцы пазамінулага дзесяцігоддзя мінскія гарадскія ўлады прынялі рашэнне адкрыць пункт рэгістрацыі асоб без пэўнага месца жыхарства. Размяшчаўся ён у доме 19/2 па Лагойскім тракце. Лік бяздомных ішоў на сотні. Так паўстала пытанне аб адкрыцці спецыялізаванага прытулку.

92 месцаў на Мінск не хапае

— Дванаццаць гадоў таму Мінгарвыканкам выдзеліў нам стары закінуты будынак №42 па 1-м Дражненскім завулку (цяпер — працяг вуліцы Ваўпшасава). За бюджэтныя сродкі яго адрамантавалі, прывялі ў належны стан. І ў кастрычніку 2001 года да нас прыйшлі першыя бадзягі. Тады наш прытулак быў адзіны ў краіне, — успамінае **дырэктар дома начнога знаходжання Мікалай Вяркееў**.

Прытулак разлічаны на 92 чалавекі. Улетку ён запаўняецца прыкладна на 70%. Яно і зразумела: цёплыя ночы бадзягі праводзяць у лесе ці пад мастом. Працаздольныя звычайна шукаюць магчымасць крыху падзарабіць. Яны ідуць на будоўлю падсобнікамі, ускопваюць агароды — адным словам, становяцца падзёншчыкамі. Часовы наймальнік прадастаўляе ім жыллё. Аднак гэтая вольніца доўжыцца нядоўга: усё-такі клімат у нас не афрыканскі. Прыходзіць восень, і беспрытульных візіцёраў, якія жадаюць атрымаць дах над галавой хаця б на 8 гадзін, становіцца значна больш. Ужо ў лістападзе амаль не знайсці ночы, каб не былі заняты ўсе ложкі.

Засяляць бадзяг пачынаюць штодня а шостай гадзіне вечара. Тых, хто вырашыў незадоўга да гэтага сагрэцца спіртным, не пускаюць: п'яны чалавек сябе паводзіць адэкватна не можа. Фельчар выдае накіраванне на флюараграфію, агляд у тэрапеўта, дэрматолага і прышчэпкі. Кожнага з кліентаў чакае абавязковы душ. А зусім хутка ў прытулку з'явіцца ўласная дэзынфекцыйная камера.

У пакоі беспрытульнаму вызначана ложка-месца. З апоўначы да восьмай раніцы — сон. Вядома, сілком бяздомных з прытулку ніхто не выганяе. Яны сыходзяць на дзённы час сутак самі. Усё-такі ёсць шанц дзесьці падзарабіць — на будоўлі, на рынку ці проста зборам макулатуры ды шклатары.

З кожным кліентам заключаецца асабісты дагавор на падставе яго заявы. Тэрмін дзеяння дагавора звычайна складае адзін месяц. Аднак у выключных выпадках можа падаўжацца і да аднаго года — калі трэба ўстанавіць асобу чалавека, аднавіць дакументы. Калі ж пасля гэтага высвятляецца, што чарговы кліент — пенсіянер, яму трэба афарміць дакументы на атрыманне пенсіі ці накіраванне ў дом-інтэрнат. Здараецца і так, што можна не паспець зрабіць усё гэта нават за год.

Дыягназы — на «выбар»

Тыповы партрэт гарадскога валацугі складаны. Гэта мужчына сярэдняга ўзросту, які невядома калі ў апошні раз галіўся і мыўся. Ад яго зыходзіць непрыемны пах. Каб адшукаць нешта ядомае, ён рыецца ў кантэйнерах для смецця.

— Складана адшукаць дыягназ, які б дактары не паставілі нашым «кліентам», — гаворыць фельчар Ларыса Шыловіч. — Часцей за ўсё прыходзяць гіпертонікі, у зімовы перыяд — шмат людзей з абмаражэннямі, пераломамі канечнасцяў. Радзей — з праблемамі лёгкіх. Гастрыты, амаль ва ўсіх праблемы з печанню, язва... Яно і вядома: доўгі час бадзягі ўвогуле не займаліся сваім лячэннем і харчаваліся чым Бог пашле. Але супраць медыцынскага агляду паўстаюць даволі ваяўніча. Вось таму і прыходзіцца быць адначасова і фельчарам, і псіхолагам, і дыпламатам.

Атрымалася проста неверагодная ў звычайным жыцці сітуацыя: у кватэры жывуць адразу дзве жонкі аднаго чалавека.

Бадзяжніцтва — гэта свабода ад усяго, але ў вельмі скажоным сэнсе. І шэрагі бяздомных папаўняюцца вельмі проста. Хтосьці прадаў сваё ранейшае жыллё, а грошы прагуляў або згубіў. Іншы вярнуўся з калоніі і не знайшоў сябе ў гэтым жыцці. А кагосьці выгналі з дому родныя дзеці, каб не прыглядваць за старым і нямоглым родзічам. І рабацягі з заводаў, і людзі з дзюма вышэйшымі адукацыямі становяцца на гэты шлях, які ім здаецца найлепшым выйсцем з жыццёвай сітуацыі.

— Быў нават выпадак, калі мы вярнулі бацьку ў сям'ю, — працягвае Мікалай Вяркееў. — Сын паабяцаў яго ўзяць. Але ўжо праз паўгода пенсіянер зноў пагрукаў у нашы дзверы. Аказалася, што сын — заўзяты лайдак. Працаваць ён лічыць вышэй за свой гонар, а есці і піць, вядома ж, хочацца. Дзе знайсці грошы? Самы лёгкі варыянт — выбіць у старога пенсію. А калі бацька не згадзіўся яе аддаць, то апынуўся на вуліцы. Мы дапамаглі яму з'ехаць на вёску...

Валацугі рэдка ходзяць па адным. Закон джунгляў гаворыць: кожны сам за сябе ці агулам. Іншых варыянтаў тут не існуе. Бадзягі сустракаюцца ўпершыню каля таго ж магазіна ці на лаўцы ў парку. Разгаварыліся аб жыцці, пасля запрасілі навічка на кубачак гарачыльнага. Пусцілі пераначаваць у шалашык. Назаўтра яны ўжо сябры. Усё, чалавек знайшоў падтрымку, няхай сабе і такую. І яго пачынае засмоктваць у гэтую багну, выбрацца з якой вельмі складана.

— Ведаеце, у бадзяг, калі яны толькі прыходзяць да нас, своеасаблівая псіхалогія. Часта яны схільныя абвінавачваць у тым, што дакаціліся да такога жыцця, усіх, акрамя сябе. І добра, калі кожны дзясяты прызнаецца: маўляў, вінаваты я. Такі вось метад абароны. Я даўно прыкмеціў: шанц вырвацца ёсць на працягу месяца. Калі ж гэтага не адбылося — пішы прапала. Добра, калі адзін чалавек з некалькіх дзясяткаў задумаецца: «А чаму я так жыву?» Калі нам удалося выцягнуць хаця б аднаго чалавека — гэта ўжо подзвіг.

«Дома гэта рабіла жонка...»

У грамадстве дом начнога знаходжання атаясамліваецца выключна з начлежкай. Але гэта толькі адна з яго функцый. Тут дапамагаюць уладкавацца на працу, аднавіць згубленыя дакументы. Ды вось толькі бадзягі не заўсёды жадаюць развітацца з вольніцай.

Тыповая сітуацыя: прыходзіць чалавек і просіць уладкаваць яго на працу. Калі працоўнай кніжкі няма, вядома ж, яго возьмуць толькі на некваліфікаваную спецыяльнасць кшталту дворніка ці грузчыка. Вось тут і пачынаюцца выбрыкі. Па-першае, на працу трэба заўжды хадзіць цвярозым, што падабаецца далёка не ўсім кліентам. Па-другое, вядома, што дворніку заплацяць менш, чым таму ж токару.

Працуюць бадзягі і непасрэдна каля самога прытулку. І гэта відаць няўзброеным вокам: снег пачышчаны да асфальту, галалёду няма. «Дапамагаюць прыбіраць у пакоях. Паступова іх прывучаюць запраўляць ложкі — я проста шкадую працу санітаркі, — гаворыць дырэктар дома начнога знаходжання. — Толькі ўявіце сабе: кожны дзень пажылой жанчыне лазіць па двух'ярусных ложках і папраўляць коўдры, калі гэта могуць зрабіць за сабой мужчыны! Адгаворка ў іх, як правіла, адна і тая ж: за мной дома гэта рабіла жонка. Рытарычнае пытанне: а дзе яна ў прытулку?

Працатэрапія — гэта як зерне, якое кідаюць у душу бадзягі. А ці прарасце яно або так і не праклюнецца, залежыць толькі ад самога чалавека.

— Трапіў да нас 50-гадовы Н. Піў ён і курыў па-чорнаму, — успамінае Мікалай Вяркееў. — Пасля нешта ў яго «пераклініла», і ён без усялякай кадзіроўкі рэзка «завязаў» з алкаголем. Працаваў на рынку, дворнікам у ЖЭСе, крыху назапасіў грошай. Параіў я яму накіравацца ў вёску пад Мінскам, каб атрымаць хоць нейкае жыллё. Н. уладкаваўся на ферму, у суседнім аграгарадку яму адразу выдзелілі кватэру. Некалькі дзён таму тэлефанаваў. Усё яму падабаецца, купіў мэблю, тэлевізар і нават старэнькі аўтамабіль, каб ездзіць на працу. І гэта быў калісьці звычайны гарадскі бомж! Калі ў чалавека ёсць жаданне, ён заўжды знойдзе сабе працу. Усім нашым лайдакам, якія шукаюць працу, я так і кажу: «Едзьце на вёску, там працы хопіць заўжды. Вядома, зарплата будзе не такая, як у горадзе, але на жыццё ты заробіш».

Безумоўна, шмат хто ўжо амаль невылечна хворы на вірус неўтаймаванай вольніцы. Аднак змагацца трэба за кожнага чалавека. Праўда, вынік атрымаецца, калі ён сам гэтага захоча. Інакш — ніяк.

З жонкай нядаўна іду па праспекце і раптам чую крык ззаду: «Міхалыч!» Жонка кажа, усміхаючыся: «Гэта твае». Бачу: наш былы выхаванец ідзе побач з цяжарнай маладой дзяўчынай. Спыніліся, паразмаўлялі з ім. Ёсць у іх хата, ёсць дабрабыт, ёсць пастаянная праца і лад у сям'і. А што яшчэ простаму чалавеку трэба?

Тым часам мы кіруемся ў спальны пакой. У вочы кідаюцца шчыльна састаўленыя двух'ярусныя ложкі. У прамежках паміж імі стаяць невялікія тумбачкі з пажыткамі пастаяльцаў. Вось толькі саміх людзей тут няшмат. Удзень застаюцца толькі хворыя. Відаць, як побач з ложкамі стаяць мыліцы...

Ж. жыве ў прытулку разам з маці. Хутка яны абедзве паедуць у дом-інтэрнат. Ужо рыхтуюцца дакументы. А пакуль што ўжо чацвёрты месяц Ж. бавіць вольны час тым, што вырабляе прыгожыя дробныя рэчы — габелены, кубачкі, фігуры жывёл...

— Мы самі родам з Казахстана. Праўда, лёс склаўся так, што аказаліся ў Беларусі. Не плацілі своечасова за камуналку, вось нас і папрасілі аднойчы на вуліцу. Сваякоў тут у нас няма. Ёсць толькі адзін сябар, які наведвае нас рэгулярна...

«Жывы нябожчык»

Падчас вайны рэдка, але здараліся «шчаслівыя памылкі». Пасля чарговага бою камандаванне не далічвалася на праверцы некалькі чалавек з асабістага саставу і высылала іх родным самыя страшныя лісты, якія ў народзе называлі «пахаванкамі». Так у сям'ю прыходзіла вялікае гора. Але пасля вайны баец шчаслівa вяртаўся дадому. Чым, вядома, прыводзіў у ступар сваіх родных: фактычна ж чалавека ўжо пахавалі, а ён жывы... Так, напрыклад, было з пісьменнікам Васілём Быкавым.

Здараюцца падобныя рэчы і ў наш час. Некалькі гадоў таму муж і жонка развяліся. Асабісты рахунак кватэры яны падзялілі і працягвалі жыць фактычна пад адным дахам. Жанчына праз некаторы час пачала піць. Аднойчы яна вырашыла сысці з дому і падацца на «вольныя хлябы». Пачала бамжаваць, яе прытулкам стаў падвал звычайнай хрушчоўкі, у якім пасялілася кампанія бадзяг. Глыбокай ноччу там адбыўся моцны пажар. Ратаўнікі прыехалі на выклік, патушылі полымя і знайшлі абгарэлае жаночае цела. Муж апазнаў па астанках сваю жонку. Яе пахавалі на Паўночных могілках як належыць, паставілі помнік. Праз некаторы час удавец сустрэў іншую жанчыну і ажаніўся з ёй.

Здавалася б, жыццё наладзілася. Ды дзе там! Аднойчы міліцыянеры прывезлі ў прытулак некалькіх асоб без пэўнага месца жыхарства. Сярод іх была і жанчына. Ёй пачалі выпраўляць страчаныя дакументы. І пры высвятленні асобы аказалася, што гэта і ёсць... тая самая нібыта памерлая жонка! Яна зноў пасялілася ў ранейшай кватэры. Аднак за гэты час яе былы муж памёр. І атрымалася проста неверагодная ў звычайным жыцці сітуацыя: у кватэры жывуць адразу дзве жонкі аднаго чалавека!

❍❍❍

Бюджэтныя выдаткі на аднаго пастаяльца прытулку дасягаюць сумы ў 160 тысяч рублёў на дзень. Але дом начнога знаходжання — гэта не дабрачынная гасцініца, як можна падумаць. Мэта яго ў іншым — рознымі сродкамі даказаць валацугу, што яго лад жыцця шкодны ў першую чаргу для яго самога, дапамагчы вырвацца з гэтага балота. А які выбар зробіць бадзяга — залежыць ужо толькі ад яго самога...

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■

ДАРЭЧЫ

«Сацыяльны патруль» ідзе на дапамогу

У Мінску з 16 снежня мінулага года па 10 сакавіка 2014 года праходзіць акцыя ў дапамогу асобам без пэўнага месца жыхарства «Сацыяльны патруль». Яе арганізатарамі выступілі Мінгарвыканкам сумесна з Мінскай гарадской арганізацыяй Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа і Беларускай праваслаўнай царквой.

У кожным раёне сталіцы арганізаваны пункты аказання юрыдычных, псіхалагічных і сацыяльна-гігіенічных паслуг асобам без пэўнага месца жыхарства. Таксама ў кожным раёне горада ў тэрытарыяльных аддзелах Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа функцыянуюць пункты выдачы цёплай вопраткі і гарачага харчавання для такіх людзей.

Падчас акцыі будуць праводзіцца і міжведамасныя рэйды для таго, каб выявіць і своечасова аказаць дапамогу асобам без пэўнага месца жыхарства.

Святлана БУСЬКО.

■ Падсвядомае

ЯК «УКЛЮЧАЕЦЦА» МЕХАНІЗМ САМАРАЗБУРЭННЯ?

Гэта трывожная з'ява мае тэндэнцыю да росту ў некаторых краінах. Дзе шукаць карані такой з'явы, як самагубства, чым абумоўлены такія паводзіны людзей, расказвае псіхолаг Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансера Настасся ХНЫКАВА. Паводле яе слоў, неабходна асобна разглядаць тры ўзроўні аўтаагрэсіі: біялагічны, псіхалагічны і сацыяльны.

Невыносны боль і хворыя гены

— На біялагічным узроўні суіцыд цесна звязаны з псіхічнымі і саматычнымі захворваннямі. Праз моцны боль чалавек пакутуе і душэўна, і фізічна, так што не можа адэкватна ацэньваць тое, што адбываецца. У выпадку не вельмі моцнага псіхічнага адхілення (або цялеснага захворвання) самазабойца спачатку спрабуе змяніць успрыняцце сітуацыі з дапамогай псіхатропнага рэчыва (таго ж алкаголю), а пасля ўжо перайсці да асноўнай часткі плана.

У XX стагоддзі пачалі развівацца модныя цяпер і праблемныя з этычнага пункту гледжання тэорыі выраджэння. У іх дэкларуецца спадчынны характар многіх, у тым ліку і псіхічных, захворванняў і іх сувязь са злачыннымі і суіцыдальнымі паводзінамі. Назапашванне ў хворым патомстве хворых людзей пашкоджаных генаў абавязкова праявіцца фізічнай, псіхічнай або сацыяльнай паталогіяй.

Рэкамендацыі вядучага швейцарскага псіхіятра Блэйлера леглі ў аснову прынятага ў Германіі ў 1933 годзе закона аб прымусовай стэрылізацыі хворых з прыроджанай прыдуркаватасцю, шызафрэніяй і некаторымі спадчыннымі захворваннямі. Барацьба за генетычную чысціню знаходзіла адлюстраванне і ў іміграцыйнай палітыцы некаторых іншых краін.

На мой погляд, найбольш поўна і ў даступнай форме праблема выраджэння апісана ў кнігах Рыгора Клімава. Яго «Пратаколы савецкіх мудрацоў» выклікалі нямала крытыкі, у асноўным этычнага характару. Не магу прыняць некаторыя экстрэмісцкія пазіцыі гэтага аўтара. Але мой шматгадовы вопыт назірання за псіхічна хворымі людзьмі сведчыць аб праваце яго асноўных тэзісаў. Іх сутнасць простая. У чалавека з нерэалізаванымі патрэбамі і жаданнямі, звязанымі з аб'ектам, якому яны прызначаліся, фарміруецца канфлікт, паступова нарастае і ўзмацняецца агрэсія. Сітуацыя патрабуе вырашэння, а таму фарміруюцца абарончыя рэакцыі (неадэкватныя паводзіны), развіваюцца комплексы і г.д. Дакладней кажучы, «абарончыя рэакцыі» з'явяцца ў дзяўчынкі, маці якой не здольна наладзіць узаемаразуменне, забяспечыць эмацыянальную аддачу, падзяліцца цеплынёй.

Жорсткая воля бацькоў

— Аўтаагрэсія ўзнікае ў выпадку глыбокага канфлікту матываў унутры асобы. Калі аб'ект агрэсіі вельмі дарагі чалавеку або ад яго залежыць дабрабыт, то ўключаецца ахоўны механізм перанакіравання агрэсіі на іншы аб'ект або на сябе. Гэта прымальны заменнік разбуральнага першаснага імпульсу.

Дапусцім, маці моцна абмяжоўвае свабоду дзіцяці або праяўляе празмерную жорсткасць у яго выхаванні. Аднак яна ўсё роўна не перастае быць блізкім чалавекам. «Несвабодная» ж асоба патрабуе свабоды, і галоўным інструментам у дасягненні гэтай мэты з'яўляецца агрэсія, прызначаная змяніць жыццёвую сітуацыю. Вось вам канфлікт, які патрабуе вырашэння. І такое вырашэнне знаходзіцца. Калі мы даследуем жыццё многіх «змагароў за ідэю», экстрэмістаў, рэвалюцыянераў, ненавіснікаў якіх-небудзь нацый, палітычных рухаў або рэлігійных вучэнняў, то дакапаемся да траўмуючай маці або жорсткага бацькі. Калі патрэбны знешні аб'ект не трапляецца, то агрэсія можа пераносіцца і на сябе. Адсюль — самаразбуральныя паводзіны або суіцыд.

Ёсць і іншы аспект у псіхалагічных прычын аўтаагрэсіі. Ён датычыцца істэрычных або дэманстратыўных паводзін, як ні дзіўна, хаваецца там, дзе яе можна было б чакаць менш за ўсё, — у рэлігіі. Акрамя іншага, рэлігія — гэта сукупнасць табу, рэкамендацый, якія ідуць уразрэз з першаснымі імпульсамі. Напрыклад, забарона пралюбадзейства перашкаджае інстынктам чалавечай прыроды. Патрабаванне не проста адмовіцца ад знішчэння ворага, але і палюбіць яго таксама не спрыяе разрадцы ўнутранага напружання. Глыбока гуманны па сутнасці, такі стыль паводзін на практыцы прыводзіць да агрэсіі і нарастання ўнутранага канфлікту. Толькі нямногім шчасліўцам удаецца так трансфармаваць асобу, каб укараніць у свой унутраны свет рэлігійныя патрабаванні. У абсалютнай большасці рэлігійнага насельніцтва перыядычна назіраецца спантанны выкід нематываванай агрэсіі, што і стварае вакол прыхільнікаў рэлігійных вучэнняў непрывабны арэол ваяўнічага фанатызму.

У некаторых выпадках агрэсія абарочваецца супраць самога чалавека, ператвараецца ў аўтаагрэсію. Гэта падсілкоўваюць канцэпцыі віны і выратавання. Любая «правіннасць» нібыта павінна быць пакарана. Чаканне гэтай кары невыноснае, а таму сам «вінаваты» імкнецца наблізіць час расплаты. Так ён пачынае рабіць памылкі, якія прыводзяць да разнастайных траўмаў і непрыемнасцяў. Атрымаўшы «па заслугах», чалавек перажывае палёгку — нібыта расплаціўся.

Раздзьмутае пачуццё ўласнай значнасці ўнушае чалавеку думку, што яго жыццё настолькі каштоўнае, што можа паслужыць «валютай» для расплаты, прычым валютай каштоўнай. Калі падумаць цвяроза, то ніякай каштоўнасці для пацярпелых смерць віноўніка, як і яго пакуты, не маюць. Страта блізкіх і здароўя ніяк не аднаўляецца з дапамогай пакут і пакаяння злачынцы. Аднак эгацэнтрызм дыктуе свае правілы, і таму той, хто правініўся, абавязкова хоча загладзіць сваю віну. Падсвядомы пошук смерці ўвасабляецца ў самаразбуральных паводзінах, і аднойчы прыводзіць да гібелі, якая ёсць не што іншае, як завуаляваны суіцыд.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Выставы

«Крохкія ўспаміны»

Напярэдадні Новага года ў цэнтральнай бібліятэцы г. Жодзіна адкрылася выстава савецкіх ёлачных цацак, арганізатарам якой удалося ўзнавіць атмасферу мінулага. Старыя паштоўкі і газеты, шары з савецкай сімволікай і выявамі правадыроў пралетарыяту, фігуркі касманаўтаў, цацкі з ваты…

— Людзі з ахвотай перадавалі нам свае крохкія ўспаміны, засмучаліся, што многае пабілася ці згубілася, — кажа ідэйны арганізатар выставы мастачка Алена Пятроўская. — Аднак тыя, хто даваў нам цацкі толькі на час выставы, потым, пабываўшы на ёй, вырашылі зрабіць падарунак… Бо гэта сапраўдная прыгажосць, якая павінна радаваць іншых.

Сама цацка, паводле слоў Алены Аляксандраўны, рэч унікальная. Па ёй, напрыклад, людзі могуць прасачыць гісторыю нашай краіны. Напрыклад, як зорка з каляднай ператварылася ў савецкую? Васьміканцовую Віфлеемскую памянялі на пяціканцовую, анёлаў — на піянераў і чырвонаармейцаў, потым яшчэ і на ёлачных цацках з'явіліся серп і молат, хрушчоўская кукуруза, касманаўты, спадарожнік «Мір»…

Усё гэта і шмат чаго іншага да канца студзеня можна ўбачыць на выставе «Крохкія ўспаміны».

Віталь ЖУРАЎСКІ

ЦУКАР, ЯКІ МАЦУЕ

І КАЛДУНЫ З ПАЛЯНДВІЦЫ І БАРАНІНЫ: гастранамічная спадчына Мельхіёра Ваньковіча

Так ужо склалася, што сярэднестатыстычны сучасны беларус пра жыццё ў Заходняй Беларусі ведае нямнога. Зразумела, у міжваеннай Рэчы Паспалітай жылося няпроста, аднак карціна таго жыцця не зводзіцца цалкам да палітычных і нацыянальных рэпрэсій. Большасць людзей цяжка працавала, спрабавала зарабіць нейкую лішнюю залатоўку, набыць патрэбнае для дзяцей, паглядзець новае кіно, патанцаваць пасля цяжкой працы. Бо жыццё ў сваёй аснове заўжды аднолькавае — каму-каму, а Кухмістру гэта бачна лепш за іншых.

Дык вось, жылі неяк нашы людзі і пры Пілсудскім. Большасць, сапраўды, нялёгка. Гаспадарка цяжка аднаўлялася пасля ваеннай разрухі. З аднаго боку — Савецкі Саюз, з другога — Захад, які зладзіў амаль што эканамічную блакаду. А калі ў канцы 1920-х надышла Вялікая дэпрэсія, зрабілася зусім цяжка. Экспартаваць адноўленая дзяржава магла мала што. Напрыклад, цукар. Вось яго і спрабавалі прадаваць за мяжу, каб неяк звесці канцы з канцамі. Але заходнія капіталісты людзі жорсткія, асабліва ў цяжкія часы. Дык яны так збілі цэны на той цукар, так выкруцілі рукі экспарцёрам, што польскі цукар, у тым ліку і выраблены з беларускіх буракоў, прадаваўся ў Англіі за 17 тагачасных польскіх грошаў за кілаграм, хаця на радзіме каштаваў ажно 1 злоты 55 грошаў. Бо высокія былі акцызы на цукар, якія давалі польскай дзяржаве больш грошай, чым каштавала будаўніцтва ўсіх дарог. І за гэтыя ж грошы аплачваўся дэмпінгавы экспарт цукру на Захад. Кажуць, што кемлівыя англійскія фермеры пачалі нават карміць польскім цукрам… свіней, так што нават гэта збіла цэны на англійскі бекон і яшчэ больш ускладніла эканамічнае становішча Польшчы, якая таксама той бекон экспартавала. Такія вось эканамічныя парадоксы. Так, часам «эфектыўныя менеджары» дураць саміх сябе і сваю краіну.

Цукар мацуе.

Але нічога лепшага прыдумаць не змаглі, як наладзіць масіраваную рэкламу цукру дома. І даручылі вядомаму публіцысту (а па сумяшчальніцтве — капірайтару) Мельхіёру Ваньковічу вынайсці магічную формулу, якая прымусіла б спажыўца купляць больш цукру.

Мельхіёр Ваньковіч, трэба адзначыць, наш зямляк. На жаль, дагэтуль на Беларусі амаль невядомы. Ён нарадзіўся 10 студзеня 1892 года ў маёнтку Калюжыцы (сучасны Бярэзінскі раён), у тым самым маёнтку і той самай сям'і, дзе стагоддзем раней нарадзіўся вядомы мінскі мастак Валентый Ваньковіч. Яшчэ да Другой сусветнай вайны Мельхіёр Ваньковіч праславіўся як «кароль польскага рэпартажу», а яго праца ваеннага карэспандэнта пры арміі генерала Андэрса яшчэ больш узмацніла гэтую славу. Ваньковіч пражыў доўгае, нялёгкае і слаўнае жыццё (памёр у 1974 годзе), у якім знайшлося месца і эмігранцкім бадзянням, і зняволенню ў ПНРаўскай турме за незалежную інтэлектуальную пазіцыю. Дарэчы, незадоўга да смерці ён стварыў яшчэ адзін «хітовы» рэкламны слоган, для авіякампаніі LOT: «LOTам — бліжэй». Яго кнігі «Шчанячыя гады», «Аповесць пра бітву за Монтэ-Касіна», «Зёлкі на кратары», «Туды-сюды», у якіх шмат месца адведзена і страчаным рэаліям Беларусі, зрабіліся класікай польскай літаратуры XX стагоддзя і ў значнай ступені «расцяганы» на цытаты — мудрыя, часам прыкрыя і саркастычныя.

Дык вось, у 1931 годзе для цукровых заводчыкаў ён стварыў рэкламны слоган усяго з двух слоў: «Cukier krzepi!» (Цукар мацуе). Была праведзена маштабная рэкламная кампанія ў прэсе, праз постары ў крамах і іншае, якая заклікала купляць больш цукру, бо ён быццам бы карысны для здароўя, асабліва для дзетак. І косці ад яго нібы мацнеюць і растуць хутчэй. Усяго было створана некалькі дзясяткаў відаў рэкламных плакатаў, якія апелявалі пераважна да жанчын. І на нейкі час сітуацыя з продажам цукру істотна палепшылася, бо якая ж маці пашкадуе неабходнага для свайго дзіцяці? Ганарар, які выплацілі Ваньковічу за гэтыя 2 словы, склаў рэкордныя 5000 злотых. Тагачасны месячны заробак прэзідэнта Рэчы Паспалітай складаў 3000 злотых, а заробак настаўніка — 300 злотых. А за 2 словы столькі наўрад ці зараблялі і лепшыя заходнія капірайтары тых часоў. Можна сказаць, што гэтыя постары ў значнай ступені сфарміравалі сімвалічную, эстэтычную атмасферу міжваенай Польшчы, у тым ліку і Заходняй Беларусі. Дагэтуль вынайдзеная Ваньковічам «магічная формула» застаецца самай вядомай у гісторыі польскага рэкламнага бізнесу. А створаная, лічыце, мінчанінам.

Выхаваны ў атмасферы шляхецкіх фальваркаў сярэдняй заможнасці, Ваньковіч выдатна ведаў традыцыйную «ліцвінскую» кухню. Спадзяюся, у гэтай рубрыцы яшчэ не раз згадаем пана Мельхіёра добрым словам. Некаторыя з зафіксаваных ім рэцэптаў увайшлі ў гісторыю, як і яго рэкламныя слоганы і афарызмы.

Калдуны Мельхіёра Ваньковіча

Складнікі: *Для цеста — 2 шклянкі мукі, 2/3 шклянкі вады, соль.*

Для начынкі *— 200 г ялавічнай паляндвіцы, 200 г барановага лою, 200 г бараніны (сцягно), 2–3 лыжкі булёну, трохі цукру, солі, маярану, часнаку.*

Для варкі *— 2 л булёну (можна з кубікаў); 80 г вяршковага масла.*

Прыгатаванне: З мукі і падсоленай вады (кіпеню, што астыў) замясіць эластычнае цеста. (Ідэальна — мясіць на працягу 30 хвілін). Выбіць аб стальніцу з усіх бакоў. Прыкрыць сурвэткай і пакінуць на 30 хвілін.

Мяса старанна ачысціць ад абалонак. Лой паставіць на 20 хвілін у маразільнік, каб зацвярдзеў. Бараніну і паляндвіцу нарэзаць дробнымі кубікамі і пасячы цесаком, лой настругаць нажом на тонкія пласцінкі. Перамяшаць мяса, лой, прыправы, дадаць трохі булёну, добра перамяшаць. Цеста, па порцыях, раскачваць у пласт таўшчынёй ільнянога палатна. Раскладаць шэрагамі «кулькі» з фаршу на адным пласце цеста, накрываць другім, абціскаючы пальцамі вакол «кулёк», вырэзаць калдуны кілішкам для гарэлкі. Укладаць калдуны ў кіпячы падсолены булён невялічкімі партыямі, каб маглі ўсплыць адным слоем. Пасля ўсплывання варыць 3–5 хвілін, затым — наступную партыю і г. д.

На дно паўміскі пакласці некалькі кавалкаў масла (нерастопленага), затым па чарзе партыі калдуноў, перакладаючы наступнымі кавалкамі масла. Есці лыжкай з глыбокіх талерак або місак. Можна пасыпаць зяленівам.

Цытаты М. Ваньковіча:

«Больш карысна мець прэтэнзіі да сябе самога, чым да іншых»

«Няма нічога больш ненадзейнага, чым лічба»

«Жанчына ўпарта верыць у тое, што мужчына зменіцца, і ў тое, што сама яна не змяняецца»

«Мама — гэта мяккія рукі. Мама — гэта меладычны голас, подых на выцятае месца. Мама — гэта само дабро і прыемнасць, нешта, што хочацца мець у кожную хвіліну жыцця побач з сабой, вакол сябе, недзе ўдалечыні. Але адначасова мама — гэта і строгія правілы, няўмольныя «ідзі спаць», жахлівыя «апрані гэта, калі ласка». Мама — расіранне шорсткім ручніком, адмераныя гадзіны, жыццё прыемнае, зычлівае, сонечнае, але без сюрпрызаў і вельмі святое.

■ Брэнд краіны

«І ТЧЭ, ЗАБЫЎШЫСЯ, РУКА...»

Было некалькі памылак, звязаных з ткацтвам. Але тым, хто іх зрабіў, можна дараваць. Першая — Максіма Багдановіча, які ў вершы «Слуцкія ткачыхі» апісаў жанчын, хаця ткацтва насамрэч было справай цяжкой і таму выключна мужчынскай. Другую зрабіў мастак Міхаіл Блішч, які на сваім палатне намаляваў таксама жанчын, дапусціўшы такую ж памылку, як і паэт. Аднак і яму можна дараваць, бо карціна атрымалася ўдалай, наскрозь пранізаным прыгожым святлом і ззяннем залатых і срэбных нітак. Была і трэцяя недарэчнасць: у Слуцкім краязнаўчым музеі дагэтуль не было ніводнага ўласнага слуцкага пояса. З гэтым вырашылі не мірыцца, і, аб'яднаўшыся, напрыканцы мінулага года случчане набылі ў калекцыю свайго горада аўтэнтычны слуцкі пояс.

Набыты слуцкі пояс.

Дырэктар Слуцкага краязнаўчага музея Наталля СЕРЫК расказала, што інфармацыю пра тое, што ў беларускага прыватнага калекцыянера ёсць слуцкі пояс і ён жадае яго прадаць, ім паведаміў адзін з мінскіх музейных супрацоўнікаў. Случчане не маглі абыякава паставіцца да такой навіны, адразу звярнуліся ў мясцовы райвыканкам, дзе таксама станоўча ўспрынялі гэту звестку і вырашылі, што трэба дзейнічаць. Быў абвешчаны збор сродкаў на набыццё слуцкага пояса.

Неабыякавых да гэтай справы людзей аказалася даволі многа. Усе мясцовыя прадпрыемствы пералічылі сродкі. Асаблівую дапамогу аказаў Слуцкі цукрарафінадны камбінат. Мясцовыя ўстановы адукацыі, хоць і з'яўляюцца дзяржаўнымі ўстановамі, таксама ахвяравалі грошы. Пералічвалі свае фінансы і звычайныя людзі. У кагосьці гэта было 20 тысяч, у кагосьці 3 мільёны — галоўнае, дапамагчы зрабіць добрую справу. Сярод гарадоў, якія падтрымалі Слуцк, былі Мінск, Жодзіна, Гомель, Салігорск.

Набыты пояс быў вытканы ў Слуцку пры Яну Маджарскім прыкладна 300 гадоў таму. Час яго вытворчасці адносяць да 1762–1780 гадоў. Ён чатырохбаковы і мае два асноўныя адценні — зялёнае і чырвонае. Пояс знаходзіўся ва ўжытку, аднак да нашага часу захаваўся даволі добра. Знешне ён абсалютна цэлы, хаця экспертыза, якая праводзілася ў Нацыянальным мастацкім музеі, паказала, што насамрэч ён сшыты — хоць заўважыць гэта амаль немагчыма. Пояс вытканы з шаўковай, сярэбранай і сярэбранай пазалочанай («залатой») ніткі. На ім зроблены тыповыя раслінныя матывы пнёў, якія «цвітуць». На адным канцы пояса выткана двухбаковая метка «SLUCK».

Гэты выраб стаў 6-м слуцкім поясам у Беларусі.

Наталля Серык адзначае, што самі случчане вельмі рады такому набыццю і ставяцца да гэтага як сапраўдныя патрыёты. Калісьці аналагічны пояс прывезлі сюды на экспанаванне на ноч музеяў, якая праводзілася тут упершыню. Нягледзячы на дрэннае надвор'е, расказвае Наталля Серык, народу сабралася надзвычай шмат. Такі самы ажыятаж выклікала і Слуцкае Евангелле, якое прывезлі ў наступны раз. Таму ўласны набыты рарытэт, мяркуе дырэктар, будзе карыстацца вялікай цікавасцю наведвальнікаў.

Дырэктар Слуцкага краязнаўчага музея Наталля СЕРЫК.

З гісторыі

У 1736 годзе браты Радзівілы заснавалі ў прыгарадзе Нясвіжа мануфактуру (ці, па-тагачаснаму, персіярню), якая затым «пераехала» ў Слуцк. Для працы на ёй запрасілі самых выдатных майстроў з Турцыі і Персіі. Але неўзабаве князь накіраваў мясцовых маладых рабочых Я. Гадоўскага і Т. Хаецкага ў Станіслаў для навучання (у той час Станіслаў славіўся вытворчасцю паясоў). Менавіта адтуль было завезена і абсталяванне для фабрыкі — некалькі ткацкіх станкоў. Пазней на фабрыку прыйшлі мясцовыя майстры. Да нашых дзён дайшлі іх прозвішчы — Іосіф Барсук, Міхаіл Баранцэвіч, Лойка, Канчыла і іншыя.

Росквіт слуцкай персіярні прыпадае на 1760–1770 гады, калі ёю кіраваў знакаміты майстар Аванэс Маджаранц (на мясцовы манер — Ян Маджарскі). Створаны пры ім тып пояса атрымаў назву «слуцкі», якая стала сіномімам усіх доўгіх шаўковых паясоў, дзе б яны ні выраблялі. Паясы ткаліся з шаўковых, срэбных і залатых нітак. Даўжыня іх была ад 2 да 4 метраў, шырыня — 20–40 сантыметраў. Паясы ўпрыгожваліся шыкоўным арнаментам: поле звычайна запаўнялася папярэчнымі палоскамі альбо лускавым малюнкам, канцы — гірляндамі з кветак і лісця. Сустракаліся вырабы, канцы каторых абшываліся махрамі. На абодвух канцах пояса была метка на лацінскай мове ці на кірыліцы: «Мяне зрабілі ў Слуцку», «Слуцк», «Во градзе Слуцке».

Набыты слуцкі пояс будзе два месяцы знаходзіцца ў асобнай экспазіцыі. Таму кожны ахвотны зможа свабодна яго ўбачыць. Побач з поясам размесцяцца рэпрадукцыі карцін з выявамі шляхціцаў, вопратку якіх упрыгожваюць слуцкія паясы. Будуць і фотаздымкі, на якіх можна ўбачыць, як і хто насіў гэты элемент гардэроба. Таксама будуць фота нядаўняга часу, прысвечаныя экспанаванню іншых паясоў у музеі.

Варта адзначыць, што ў Слуцку ёсць прадпрыемства «Слуцкія паясы», у якім зусім нядаўна зрабілі новы музей слуцкага пояса. Акрамя іх там можна ўбачыць станок для тканння паясоў, набыты ў Германіі. Нагадаем, што тэхналогію, па якой будуць вырабляцца паясы — сапраўдны брэнд краіны, распрацавалі ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце («Звязда» пісала пра гэта 18 верасня 2012 года). Тут жа можна будзе набыць і новастворaны сувенірны слуцкі пояс.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

г. Слуцк

Будынак Слуцкага краязнаўчага музея.

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

ТАРАШКЕВІЧЫ

Браніслаў Тарашкевіч — аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ»

Многія з нас чулі або самі выкарыстоўвалі слова «тарашкевіца». Звычайна гэтым словам называецца адзін з варыянтаў беларускай арфаграфіі, які існаваў да правапіснай рэформы 1933 года. Слова «тарашкевіца» ўтворана ад прозвішча выдатнага грамадскага і палітычнага дзеяча, асветніка, вучонага-мовазнаўцы, пісьменніка, публіцыста і перакладчыка Браніслава Адамавіча Тарашкевіча. Браніслаў Тарашкевіч адносіцца да ліку інтэлігентаў пачатку XX стагоддзя, якія прысвяцілі ўсё сваё жыццё ідэі нацыянальнага адраджэння беларускага народа, яго мовы, гісторыі і культуры.

Нарадзіўся Тарашкевіч 8 (20) студзеня 1899 года ў засценку Мацюлішкі, недалёка ад Вільні, у сялянскай сям'і. Бацькі не мелі магчымасці вучыць сына, але імкненне юнага Браніслава да ведаў дазволіла яму, адзінаму з усіх дзяцей сям'і, атрымаць адукацыю. Спачатку ён вучыўся ў Віленскай гімназіі, затым на гісторыка-філалагічным факультэце Петраградскага ўніверсітэта, дзе і застаўся працаваць.

У 1918 годзе падрыхтаваў і выдаў у Вільні ў друкарні Марціна Кухты першы падручнік для школьнікаў «Беларуская граматыка для школаў». Граматыка была апублікавана дзвюма графікамі — лацінкай і кірыліцай. Выданне «Беларускай граматыкі» стала сапраўднай падзеяй у гісторыі беларускага мовазнаўства: яно адкрыла новую эпоху ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. У кнізе аўтар абагульніў, сістэматызаваў і замацаваў беларускамоўныя пісьмовыя традыцыі, якія склаліся да гэтага часу, улічыў лінгвістычны вопыт папярэднікаў, у першую чаргу сваіх настаўнікаў — А. Шахматава і Я. Карскага. Усё гэта садзейнічала станаўленню нормаў літаратурнай мовы. Прайшло амаль сто гадоў, а правілы, сфармуляваныя Браніславам Тарашкевічам, застаюцца актуальнымі да нашых дзён. Больш за тое, некаторыя публіцыстычныя выданні і асобныя творцы і сёння карыстаюцца нормамі, адлюстраванымі ў «Беларускай граматыцы для школаў» Браніслава Тарашкевіча.

У 1921–1922 гадах ён працаваў выкладчыкам і дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі ў Мінску. Сотні юных беларусаў мелі шчасце слухаць лекцыі па беларускай мове і літаратуры, якія ім чытаў слынны вучоны. У гэты ж час Тарашкевіч стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, якое налічвала больш за 30 тысяч чалавек. Таварыства адыграла выключную ролю ў пашырэнні беларускамоўнай асветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Таварыства беларускай школы вяло сапраўдную барацьбу з польскімі афіцыйнымі ўладамі за арганізацыю і існаванне беларускіх школ, за дэмакратызацыю адукацыі, арганізацыю нацыянальных выдавецкіх цэнтраў. Натхняльнікам самых розных мерапрыемстваў Таварыства выступаў сам Тарашкевіч.

У гэты ж час гэты аўтарытэтны вучоны і грамадскі дзеяч пачынае актыўна займацца палітыкай. У 1922 годзе ён абраны паслом (дэпутатам) польскага сейма, а ў 1922–1924 гадах з'яўляўся старшынёй Беларускага пасольскага клуба. З трыбуны сейма пастаянна выступаў у абарону сацыяльных і нацыянальных правоў беларусаў на тэрыторыі Польшчы, адстойваў права землякоў на навучанне на роднай мове. У 1925 годзе заснаваў Беларускую сялянска-работніцкую грамаду, а пазней стаў членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У 1927 годзе быў асуджаны польскімі ўладамі на 12 гадоў турмы. Падставай для арышту была названа спроба дзяржаўнага пераваротa з мэтай далучэння Заходняй Беларусі да Савецкага Саюза.

Знаходзячыся ў зняволенні, Тарашкевіч не пакідаў творчую работу: ён працаваў над падрыхтоўкай гістарычнай граматыкі беларускай мовы, пераклаў на беларускую мову паэмы «Ілія́да» Гамэра і «Пан Тадэвуш» Адама Міцкевіча. Падчас зняволення ён быў абраны акадэмікам толькі што створанай у Мінску Беларускай акадэміі навук.

Праз два гады спецыяльным распараджэннем Прэзідэнта Польшчы быў вызвалены. Пазней, у 1931 годзе, Браніслаў Тарашкевіч зноў быў арыштаваны і асуджаны на 8 гадоў катаржнай турмы.

У 1933 годзе ў выніку дамовы паміж Польшчай і СССР адбыўся абмен двума знакавымі палітвязнямі — палітыкам і вучоным, вязнем польскіх астрогаў Браніславам Тарашкевічам і драматургам, акцёрам і рэжысёрам Францішкам Аляхновічам, вязнем савецкага канцлагера. Па сведчанні вядомага даследчыка жыцця і творчасці Браніслава Тарашкевіча прафесара Арсеня Ліса, Мінск вітаў Тарашкевіча як трыумфатара, героя, рэвалюцыянера. Ён атрымаў пасаду намесніка загадчыка польскага аддзела ў Міжнародным аграрным інстытуце ў Маскве. Аднак савецкай уладзе не патрэбны былі адукаваныя інтэлігентныя нацыянальна арыентаваныя людзі. У 1937 годзе ў выніку сталінскіх рэпрэсій фактычна была вынішчана творчая інтэлігенцыя Беларусі. Не абмінуў трагічны лёс і Браніслава Тарашкевіча. 6 мая 1937 года ён быў арыштаваны па справе так званага «Беларускага нацыянальнага цэнтра». 5 студзеня 1938 года выдатны дзеяч беларускага народа Браніслаў Тарашкевіч быў асуджаны «двойкай» (камісіяй НКУС СССР і пракурорам СССР) да найвышэйшай меры пакарання. 29 лістапада 1938 года прысуд быў прыведзены ў выкананне: Браніслаў Тарашкевіч быў расстраляны. Праз 19 гадоў Тарашкевіч быў рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у сувязі з адсутнасцю складу злачынства.

У Беларусі імя Браніслава Тарашкевіча ўшанавана ў назвах вуліц у горадзе Мінску, Маладзечне і гарадскім пасёлку Радашковічы Маладзечанскага раёна. З 1969 года імя Тарашкевіча носіць ліцэй з беларускай мовай навучання ў польскім горадзе Бельск-Падляскі.

Ігар КАПЫЛОЎ.

ПАХОДЖАННЕ ПРОЗВІШЧА І СУЧАСНЫЯ ТАРАШКЕВІЧЫ

Прозвішча Тарашкевіч паходзіць ад народнай формы Тараска (варыянт Тарашка), утворанай ад хрысціянскага імя Тарас (у старажытнагрэчаскай мове абазначала «бунтар»). На тэрыторыі сучаснай Беларусі прозвішча Тарашкевіч сустракаецца толькі ў некалькіх рэгіёнах: Полацкі раён (Віцебская вобласць), Астравецкі, Воранаўскі, Іўеўскі, Шчучынскі раёны (Гродзенская вобласць), Дзяржынскі, Пухавіцкі раёны (Мінская вобласць).

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска»

(во изменение ранее опубликованной в газете «Минский курьер» от 28 марта 2012 года проектной декларации)

Застройщик – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а. Тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

Режим работы – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Многоэтажный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения в районе пересечения ул. Тимошенко, Шаранговича № 1 по генплану.

Объект проектирован с делением на 4 пусковых комплекса, в том числе:

- 2-й пусковой комплекс – магазин продовольственных товаров, аптека, стоматология, помещение общественного назначения № 1.

Сведения о цене на объект долевого строительства (на дату опубликования проектной декларации)

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 года № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь» для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается:

- аптека общей площадью 37,68 кв.м.

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах сентября 2013 года с учетом прогнозных индексов цен в строительстве и составляет: **19 763 000** белорусских рублей; при строительстве цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ.

Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства 2-го пускового комплекса – I квартал 2014 года.

С планировкой объекта долевого строительства и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- быть готовым оплатить в течение 5 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 90 процентов стоимости объекта долевого строительства.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска»

(во изменение и дополнение ранее опубликованной в газете «Звязда» от 14 сентября 2013 г. проектной декларации и опубликованной в газете «Звязда» от 21 декабря 2013 г. проектной декларации)

Застройщик – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

Режим работы – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 3 (2-ая очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Десятиэтажный крупнопанельный жилой дом на 78 квартир состоит из двух секций М464М с теплым чердаком, техподпольем, остекленными лоджиями со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 14 квартир:

7 двухкомнатных квартир площадью 74,81 кв. метров, цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов и составляет 11 664 900 рублей;

7 двухкомнатных квартир площадью 80,43 кв. м, цена 1 кв. м общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов и составляет 10 711 300 рублей.

Начало строительства – август 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – май 2014 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
►**ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) **извещает**
о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды

здания наружного платного туалета с инв. № 630/С-46818 сроком на 5 лет,

принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» на праве хозяйственного ведения и расположенного по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 6 (далее – Объект).

Начальная цена с НДС – 1 743 650 бел. руб. Задаток с НДС – 174 360 бел. руб.
Сумма арендной платы в месяц с НДС, 5 543 734 бел. руб.
Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 26.11.2013.
Аукцион состоится 29.01.2014 в 10.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 24.01.2014 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.**

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by и на сайте ГКИ: **www.gki.gov.by/auction/auinf/auiar_contr/abbf9b39d36775cb.html.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: 3060057@gmail.com**

УНП 190055182

БЕРЕЗИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
Березинского района Минской области (далее ПРОДАВЕЦ)

проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Жуковец

№	Адрес земельного участка, кадастровый №	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)
1	Березинский район, д. Жуковец, 620480403101000055	0,2418 га	Электроснабжение	6327666	4603872	460387

**** Примечание: земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.***

Задаток перечисляется на р/с № 3604060201908 в ЦБУ № 602 филиала № 612 АСБ «Беларусбанк» код 810, УНН 600040856, ОКПО 4431777, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому Лоту).

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 19.02.2014 года в 10.00 по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, д. 39 (зал заседаний).

